Афіцыйна

Аляксандр Лукашэнка — старшыня Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС

Стар. 2

BELARUS 21.BY

Беларусь on-line у Інтэрнэце

Рэкламны бізнес

Беларускі твар сусветных брэндаў

Стар. 15

Кошт у Беларусі 1 000 рублёў.

14 ліпеня, 2005

Газета з Беларусі

Голас Радзімы

Газета выходзіць у другі і чацвёрты чацвер месяца.

№ 26-27 (2948 — 2949)

Выдаецца з 1955 года

Персона

Алег Рудакоў — беларус з Іркуцка

Стар. 6

NEWS FROM BELARUS

page 3

Скарбонка

Планета з імем Лілія

Стар. 8

Вяртанне

Лісты Яна Чачота да Марыі Путкамер



Стар. 11-12

Экстрым

Пакарэнне вулканаў Эквадора

Стар. 9

Хто дапамагае бежанцам

"Бежанцы і мы"

выстава-конкурс плаката на "Дызайн-біржы 2005"

Стар. 4

Да ўвагі чытачоў!

Наступны нумар газеты "Голас Радзімы" выйдзе 28 ліпеня 2005 года

3 ліпеня Беларусь адсвяткавала Дзень Незалежнасці

Фестываль

Звіняць цымбалы, грае гармонік!

Самадзейныя артысты Беларусі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Славакіі, Расіі, Украіны і іншых краін сабраліся на сваё традыцыйнае свята ў Паставах Віцебскай вобласці – VIII Міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік".

У афішы фестывалю было шмат цікавых мерапрыемстваў — конкурс выканаўцаў на народных інструментах, пацяшальна-гульнёвая праграма "Пастаўскі баль", творчая лабараторыя "Народная музычная культура на рубяжы тысячагоддзяў", тэатралізаванае прадстаўленне "Старонкі ажыўшай гісторыі", выстава народных умельцаў "Горад майстроў".

Адзначым, што высокі творчы і навуковы ўзровень фестывалю з года ў год падтрымліваецца дзякуючы аўтарытэтнаму журы, у склад якога ўваходзяць народныя артысты Беларусі прафесары Міхаіл Казінец, Міхаіл Дрынеўскі, Яўген Гладкоў, а таксама вядомыя даследчыкі і знаўцы народнай музыкі Уладзімір Гром, Валерый Башура, Валянціна Трамбіцкая. Але ўсё ж галоўнымі героямі і любімцамі публікі выступаюць народныя калектывы.

Заканчэнне на стар. 16

Падрабязнасці

IX Усеславянскі з'езд прайшоў у Мінску

У Мінску з 1 па 3 ліпеня праходзіў IX Усеславянскі з'езд. Больш 200 прадстаўнікоў з 12 славянскіх дзяржаў сабраліся ў беларускай сталіцы, каб абмеркаваць праблемы адраджэння ідэі славянскага адзінства. На з'ездзе прымалі ўдзел дэлегаты з Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Боснії і Герцагавіны, Македоніі, Польшчы, Славакіі, Чэхіі, Славеніі, Харватыі, Сербіі і Чарнагорыі, а таксама прадстаўнікі славянскіх дыяспар з Канады, Малдовы, Грузіі, Германіі, Латвіі і Эстоніі.

Заканчэнне на стар.2

Віншуем!

Уладзімір Шугля ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны

За значны ўклад у развіццё гандлёва-эканамічных і культурных сувязей паміж Беларуссю і Расіяй сустаршыня Цюменскага нацыянальна-культурнага таварыства "Беларусь" Уладзімір Шугля ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Зваротная сувязь

Ізраіль

Артыкул нагадаў пра юнацтва

Я ўвесь час чытаю матэрыялы "Дыялогу" (дадатак "Голасу Радзімы" для ізраільскай газеты "Навіны тыдня"). У № 23 мяне зацікавіў матэрыял "Афра-беларус Аляксандр Дзямідаў".

Артыкул пра Сашу Дзямідава нагадаў мне 1958 год, калі я паступіў на завочнае аддзяленне Беларускага інстытута інжынераў чыгункі (Гомель). Я вучыўся на будаўнічым факультэце, Саша на цеплавозным. Менавіта так, як напісала аўтар артыкула, вакол яго на перапынках збіраліся студэнты, сыпаліся жарты, заўсёды ён быў цэнтрам увагі. І вось праз 47 гадоў я прачытаў пра Сашу і прыгадаў яго, кучаравага і вясёлага. Калі ёсць магчымасць, паведаміце, што ў далёкім Ізраілі памятаюць яго. Перадайце яму прывітанне ад Марка (тады Марыка Вайсмана) і пажаданне моцнага здароўя.

Марк ВАЙСМАН.

АА3, Аргенціна, Арменія, Аўстралія, Аўстрыя, Балгарыя, Беларусь, Бельгія, Бразілія, Венгрыя, В'етнам, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Егіпет, ЗША, Ізраіль, Індыя, Іран, Італія, Казахстан, Канада, Карэя (Паўднёвая), Кітай, Куба, Кыргызстан, Латвія, Лівія, Літва, Малдова, Мексіка, Нарвегія, Нідэрланды, ПАР, Польшча, Расія, Румынія, Сербія, Сірыя, Славакія, Славенія, Туркменістан, Турцыя, Узбекістан, Украіна, Уругвай, Францыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эстонія, Японія

"Голас Радзімы" *ў 52 краінах*

Афіцыйна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выбраны старшынёй Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, якое адбылося ў Маскве.

Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідэра, на разгляд пасяджэння было вынесена больш як 20 пытанняў. У ліку прыярытэтных —фарміраванне Агульнага мытнага тарыфу, каардынацыя пазіцый краін —членаў ЕўрАзЭС на перагаворах па далучэнні да СГА, рэалізацыя Міждзяржаўным банкам функцый міжнароднай інвестыцыйна-крэдытнай і разліковай арганізацыі супольніцтва.

Беларусь задаволена ходам дыскусіі па стварэнні адзінай мытнай прасторы ў рамках ЕўрАзЭС. Гэты факт асабліва адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў ходзе пасяджэння Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС у Маскве.

Беларускі бок прыняў зацікаўлены ўдзел у абмеркаванні ўсіх пытанняў парадку дня пасяджэння. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ЕўрАзЭС з цягам часу пераўтворыцца ў супольнасць квітнеючых дзяржаў і інструмент эфектыўнага эканамічнага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка лічыць важным, што ўпершыню за гісторыю ЕўрАзЭС дзяржавы-ўдзельніцы адкрыта прызналі факт вядзення інтэнсіўных перагавораў з Сусветнай гандлёвай арганізацыяй.

Як паведаміў кіраўнік прэс-службы Прэзідэнта Павел Лёгкі, удзельнікі пасяджэння дасягнулі дамоўленасці аб далейшай каардынацыі дзеянняў па ўступленні ў СГА.

Беларускі лідэр падзякаваў расійскаму боку за прадастаўленне дакументаў аб рабоце, што праводзіцца Расіяй па ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

У ходзе 13-га пасяджэння Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выбраны старшынёй Міждзяржаўнага Савета Еўразійскага эканамічнага супольніцтва..

Наступнае пасяджэнне Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС адбудзецца ў Мінску ў чэрвені 2006 года.

БелТА.

IX Усеславянскі з'езд прайшоў у Мінску

Пачатак на 1-й стар.

У рабоце форуму вельмі актыўна ўдзельнічалі і прадстаўнікі беларускай дыяспары. Гэта кіраўнікі: Асацыяцыі беларусаў Эстоніі Ніна Савінава, Усеўкраінскага саюза беларусаў Ірына Аржахоўская, Беларускага грамадства Львоўскай вобласці Сяргей Кулікоў, Новасібірскага культурна-асветніцкага цэнтра імя Ефрасінні Полацкай Іван Панасюк, Цюменскага нацыянальна-культурнага грамадства "Беларусь" Уладзімір Шугля, Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Мікола Сычэўскі, Грамадства беларускай культуры горада Бендэры Прыднястроўскага рэгіёна Малдовы Ганна Лапацьева, Саюза грамадскіх аб'яднанняў беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова, Грамадскага аб'яднання беларусаў у Кыргызскай Рэспубліцы "Світанак" Аляксандр Шут. Было дасланае прывітанне ад прэзідэнта Аб'яднання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве Лявона Мурашкі.

На працягу трох дзён дэлегаты працавалі вельмі напружана. Для большай эфектыўнасці дэлегаты разышліся па секцыях у адпаведнасці са сваімі ўласнымі і прафесійнымі інтарэсамі. Усяго працавала шэсць секцый: "Парламентарыі славянскіх дзяржаў за супрацоўніцтва", "Супрацоўніцтва ў дзяржаўным і прыватным сектарах эканомікі", "Славянскі свет ва ўмовах глабалізацыі", "Славянская цывілізацыя: супрацоўніцтва ў галіне навукі, адукацыі, культуры, аховы здароўя", "Супрацоўніцтва славянскіх дзяржаў у галіне СМІ" і "Моладзь —будучае славян". На кожнай з іх абмяркоўваліся праблемы, прапаноўваліся шляхі іх вырашэння, прымаліся канкрэтныя прапановы.

На працягу ўсяго форуму адзначалася, што асновай далейшага развіцця кожнай краіны з'яўляецца ўмацаванне славянскага адзінства. Для гэтага трэба, каб незалежныя самастойныя дзяржавы эканамічна, культурна і інфармацыйна аб'ядналіся і стваралі адзінае Славянскае грамадства.

Па прапанове старшыні Міжнароднага славянскага камітэта Яна Мінаржа ў трэці раз ганаровым старшынёй Камітэта аднагалосна выбраны Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

Дата правядзення з'езда была выбрана невыпадкова. Менавіта ў гэтыя дні беларускі народ святкаваў чарговую гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Для ўдзельнікаў форуму была арганізавана экскурсія на Курган Славы і ў Хатынь, а таксама дэлегаты прынялі ўдзел у святочным шэсці і цырымоніі ўскладання кветак да помніка Перамогі на аднайменнай плошчы.

Кацярына НЕМАГАЙ.

Асоба

Дыплом лаўрэата Міжнароднай прэміі міру атрымала член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, народная артыстка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа Святлана Акружная. Гэта прэстыжная прэмія ўручаецца аб'яднанай культурнай канвенцыяй ЗША пры аддзяленні Амерыканскага біяграфічнага інстытута, які ў мінулым годзе прысудзіў ёй званне "Жанчына года – 2004".

Сэрца Святланы

Для чаго Чалавек прыходзіць на Зямлю? Чаму адны адыходзяць у небыццё, амаль не пакідаючы аб сабе ўспамінаў, імёны іншых доўга памятаюць наступныя пакаленні? Мусіць, кожны калі-небудзь задаваў сабе гэтае вечнае пытанне. Думала над ім і я, перачытваючы невялікую добра ілюстраваную кнігу Святланы Акружной "Усё пражыць —каб сэрца не разбілася". У каторы раз з задавальненнем яе перагортвала, нібы рабіла своеасаблівае падарожжа па старонках не кнігі, а жыцця прыгожай, абаяльнай Жанчыны, адданай Маці, прызнанай актрысы, парламентарыя і грамадскага дзеяча, бясконца адданага інтарэсам краіны, нарэшце, добрага чалавека.

У 1969 годзе юная Святлана Акружная яркай зорачкай зазіхацела на сцэне Віцебскага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Крынічная чысціня яе таленту была безагаворачна прынята і запатрабавана. Вось яна — даверлівая і неабароненая Анютка ва "Уладзе цемры", дзяўчынка-падлетак у "Зацюканым апостале", загадкавая і "свецкая", бязлітасная і прыгожая Марлен у "Марлен... Марлен", адчаяная Галя Чацвяртак у "А зоры тут ціхія", непераможная Жанна Д'Арк — і ў кожнай ролі — актрыса ва ўсім харастве прыроднага дару... Бліскучая ігра на сцэне, а таксама адна з галоўных ролей у дзевяцісерыйным мастацкім фільме Ігара Дабралюбава "Плач перапёлкі" не пакідалі абыяхавымі ні гледачоў, ні крытыкаў. У яе сваё бачанне свету, сваё тлумачэнне вобразаў. Зноў і зноў яе гераіні сцвярджаюць праўду і сэнс жыцця: "Людзі! Любіце гэты свет і адзін аднаго".

У 1976 годзе таленавітай актрысе, якая яшчэ не пераступіла трыццацігадовую мяжу жыццёвага шляху, прысвоена званне заслужанай. Святлана адмаўляецца ад прывабнай прапановы пераехаць у Маскву ў Тэатр на Малой Броннай. Праз некалькі гадоў Акружная ўдастоена самай высокай ацэнкі ў творчасці: яна стала народнай артысткай Беларусі. Вышэйшая тэатральная ўзнагарода краіны "Хрустальная Паўлінка", прэміі самых прэстыжных міжнародных фестываляў шмат разоў пацвердзілі гэта званне. Праслаўлены тэатральны менеджэр і рэжысёр тэатра "Адэон" з Парыжа, эксперт Савета Еўропы Малка Эллі вылучае яе як адну з самых яркіх у Еўропе выканаўцаў ролі Эміліі ў спектаклі Карэла Чапека "Рэцэпт Макропуласа". Кембрыджскі навуковы цэнтр у даведніку "2000 самых вядомых людзей у свеце" назваў Святлану Акружную жанчынай года (1997-1998). Ужо другое скліканне яна — член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Здавалася б, "зорнае" жыццё паспяховай жанчыны. Але якія выпрабаванні падрыхтаваў ёй лёс на "зорным" шляху! Якой цаной аплочаны такі цудоўны поспех?

У 1976 годзе ў аўтакатастрофе Святлана атрымала цяжкую траўму. Ачуньвала доўга. Потым з-за памылкі партнёра ў час рэпетыцыі яна падае ў аркестровую яму. Цяжкая аперацыя. Тры месяцы ў рэанімацыі адной з лепшых бальніц Мінска. Смерць маці... Не ведала тады любіміца гледачоў, што будзе яшчэ больш страшнае выпрабаванне, з-за якога яна пакіне сцэну. Не ведала, што будзе стаяць на каленях перад усім светам і Богам, ратуючы адзінага свайго сына. Не ведала, што доўгія гады ёй давядзецца іграць галоўную ролю ў жыцці па самых патрабавальных крытэрыях, на мяжы чалавечых магчымасцей —ролю Маці.

Дзіма Сцемасаў пайшоў
армію са сваімі аднагодкамі,
мог выкарыстаць адтэрмін
таму што меў ужо маленькага
на Арцёмку. Праз некалькі мес
цаў ён быў на краі гібелі... Ас
лачны разрыў спіннага мозгу,
ражэнне крыві, септычны
кроз... Цэлы год паміж жыцц
смерцю. Толькі Святлана верыл
прымусіла верыць сына ў доб
зыход. Ля бальнічнага ложка,
якім ляжаў цалкам пазбаўлен
руху і "безнадзейны", як сп
джалі ўрачы, Дзіма, яна стала і
дзелкай, і масажыстам, і сані
кай, і псіхолагам.

Праз гады Акружная вярну
ся ў тэатр. Аб яе дасягненнях
ўжо ведаеце. А Дзіма? Дзіма
іў камп'ютэр, узначальвае Ві
скае абласное таварыства інв
даў-калясачнікаў. У мінулым
дзе прыгожая Танечка стала
сябрам і каханай жонкай. Сі
сцвярджаецца, расце Арцё
прыносіць радасць і зразуме
турботу сваім блізкім, асабліва
булі.

—У жыцці я старалася не
ні на якія кампрамісы, —гаво
Святлана Арцёмаўна. —Заробі
сваёй працай, сваімі здольн
мі. Заўсёды старалася захоўв
незалежнасць, свабоду і асабі
пункт гледжання, за што вел
дорага плаціла. Але якія б пак
і цяжкасці ні праследавалі м
місія акцёра —абуджаць чала
да жыцця, дарыць веру ў неп
можнасць дабра. Шмат перажы
Але затое зараз на душы ў м
спакойна, я магу сумленна
дзець у вочы свайму сыну.

...Невысокая, нават кволая,
робіцца валявой і рашучай,
трэба дапамагчы, працягнуць
маленькую зграбную руку т
хто ў бядзе, хто моліць аб дап
зе, настойлівай і мэтанакіраван

Ганна ПАДР

Independence Day

July 3,2005

Alexander Lukashenko: "Today we are confident in our future"

Stability and independence

The Great Patriotic War claimed millions of lives for the sake of this noble goal—construction of a stable and prosperous state. The statement to this effect was made by president of Belarus at solemn meeting devoted to the Independence Day.

Paying tribute to the memory of those perished in the war and taking a look at our past, we are beginning to understand the simple truth: what a blessing the peace in our country is.

Stability and independence have an important peculiarity: they should be constantly and daily strengthened and protected, as we are doing.

First, Belarus effectively develops its economy, modernizes production and increases output of competitive goods. Our whole policy is based on the success in the economy. Second, Belarus strengthens its defensive capacity, maintains high combatant value of its Armed Forces and equips them with modern weapons. We should remember the precepts of those who were fighting for us: always keep your powder dry. Third, Belarus pursues a deliberate and many-vector foreign policy.

Development model

The most important constituent of the Belarusian development model is a strong social policy pursued for ordinary people.

According to him, this policy envisages health care service for citizens, a constant flow of investments in their professional and intellectual development and application of the equity principle for all sections of the society.

Belarus is remarkable for its socio-economic indices compared with other countries with the economy in transition on the whole. Belarus was the first among the post-Soviet republics to exceed the 1990 GDP production level. This is a vivid proof that the republic has chosen a right development way, what lets us take leading positions in the economy as well as in the socio-cultural sphere.

Belarus is among the leading countries of Europe and the CIS on the economic growth. The republic shows stable and dynamic development of the industry and considerable changes in the agricultural production.

The GDP energy and material capacity stably decreases, the production profitability grows, the amount of loss-making companies has reduced. The country has a reliable monetary-credit sphere what is proved by the Belarusian ruble stability and inflation permanent reduction.

The major goal of the country's economic development is welfare and cultural development of Belarusian people.

Bridge of cooperation

Belarus seeks to become a bridge of cooperation between the East and West, an initiator of good neighbor relations and mutual understanding, a follower of the idea of universal equal security and peaceableness.

The relations between the Republic of Belarus and Russia can serve as an example of that. The trade turnover between the two states has reached record indices and made last year USD 18 billion. This year the index is increasing as well. The Belarusian-Russian interaction in the foreign economic, defense, socio-cultural and other spheres is promoted as well.

Belarus successfully develops cooperation within the CIS and EurAsEC framework. The role of the Republic of Belarus is considerable here.Among the EU member-states Germany, Great Britain, the Netherlands and Italy are large trade partners of Belarus. This year the exports to the EU countries exceeded 46 per cent of the total amount.

The main goal of foreign policy is to strengthen the positions of the republic in the international arena in the trade-economic sphere and security system as well as in development of cultural links and all-round cooperation with states and nations.

Celebrating Belarus

Two million of citizens of Minsk and guests of the Belarusian capital took part in the celebration dedicated to the Independence Day of Belarus. Almost 350,000 of people participated in the youth musical fest Celebrating Belarus.

The head of state spent more than 3 hours with the youth on the dance pavilion dancing together with young people.

Mr. Lukashenko congratulated all the presented on the great holiday — the day of the liberation of Belarus from the Nazis.

Our heroes stood up the honor, glory and freedom of our Motherland. They gave us this opportunity to live and create, have fun and dream. They handed us the great Slavic cradle in the center of Europe. They raised our land from ruins and ashes and will to guard it vigilantly and increase its riches. For a strong and flourishing Belarus —this motto unites all the generations —both the veterans and the youth.

You are the young Belarus —our hope and support. We believe in you, in your good hearts filled with love to the Fatherland. Let us make this land a nice place for all the good people, be they Belarusians, Russians, Ukrainians, Poles, Jews, Kazakhs or Tatars — to all those for whom our blue-eyed Belarus has become home!

Let us make it so that Minsk turns into a city of peace and happiness and this Oktiabrskaya square in Nezavisimosti /Independence/ avenue near the main Palace of the Republic — becomes a place of joy!

Remember at all times and where ever you are that we have the only Motherland — our Belarus. Our future is in our hands. To the great Belarusian people! To peace! To life! To love! To Belarus!

Recognision

World Bank: the considerable economic growth in Belarus and its good influence upon the social development of the republic

This is the central conclusion made up in the economic memorandum "Belarus: window of opportunities for increasing competitiveness and ensuring stable economic growth rates" prepared by the bank, senior economist of this financial establishment Lev Freinkman has stated.

Mr. Freinkman has noted that different sections of the population enjoy advantages from the economic growth. This structure of the economic growth is not typical for the countries with the economy in transition and the population of Belarus gained more than citizens of the neighboring states.

The report discusses two periods of the economic growth: 1996-2000 and 2001 and the sequent years. "Within these two periods growth rates were different and it is important that the macro-economic policy after 2001 turned out to be more healthy and favorable for the stable growth than before", Lev Freinkman underlined.

According to the World Bank, the changes that the country has been experiencing since 2001, in particular, those in the budget and monetary policy are to the great extent positive. A higher investment activity and intensive restructuring of companies were recorded.

Along with that, experts of the World Bank admit a possibility of slowing down of the economic growth and consider that in order to retain the achieved results reforms are needed.

On the whole, the economic memorandum on the country generalizes the results of the macro-economic development of Belarus, analyses the problems and risks of the current strategy on ensuring stability. The tendencies in the sphere of manufacture, exports and restructuring of companies were taken as basic during the analysis. Apart from that, such constituents of the macroeconomic policy as the investment climate and foreign trade regime were taken into consideration. Several chapters of the report are dedicated to the results and prospects of the agricultural and energetic sectors.

International Monetary Fund: the economic growth in Belarus this year will reach about 7,1 per cent,

says the IMF annual public information notice for the Republic of Belarus.

The report acknowledges that this year the Belarusian economic growth **"will reap good results"**. According to the experts, last year the republic reached impressive indices: **"the domestic policies and favourable exogenous factors have combined to boost growth"**. Inflation halved in 2004 and in April 2005 slowed down by another 11 per cent "owing to the balanced budget, stability of the exchange rate and growing trust to the banks and national currency".

The National Bank stopped inflation financing of the governmental budgetary programs; the process of the budget consolidation continued. Gold-forex reserves increased, the state debt is not big, the growth of the payment balance deficit at the end of 2004 was smoothed over at the beginning of this year, the IMF notice says.

The experts in Washington mark that "on the whole the IMF public reports on national economies of the fund's member-states are as a rule complimentary toning down the critical remarks". However, this rule does not apply to Belarus in view of the negative attitude to the official Minsk by the official Washington —one of the fund's biggest share holders. Therefore, the acknowledging of economic successes of Belarus looks in this case like nearly "the forced recognition of indisputable facts".

Старонку падрыхтаваў Барыс ЖУКАЎ.

Хто дапамагае бежанцам

"Бежанцы і мы"

выстава-конкурс плаката на "Дызайн-біржы 2005"

На III спецыялізаванай выставе "Дызайн-біржа 2005", праведзенай Нацыянальным выставачным цэнтрам "Белэкспа" і Беларускім саюзам дызайнераў было на што паглядзець.

Асобна хацелася б засяродзіць увагу чытачоў на плакатах, тэма якіх была "Бежанцы і мы". Прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў сумесна з Міжнародным грамадскім аб'яднаннем па вывучэнні ААН і інфармацыйна-адукацыйных праграмах і Беларускім саюзам дызайнераў у рамках сумеснага праекта да Сусветнага дня бежанцаў правялі конкурс плакатаў па вышэйзгаданай тэме.

Прэзідэнт Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый Сурскі заўважыў, што ідэя падтрымкі бежанцаў як аднаго з самых уражлівых слаёў насельніцтва зразумелая дызайнерам. Дызайн, сказаў Д.Сурскі, мае ў сваёй сутнасці ідэю дапамогі і падтрымкі людзяй у самых розных сферах жыцця.

Конкурс жа быў скіраваны на тое, каб звярнуць увагу маладых людзей (у ім бралі ўдзел студэнты мастацкіх навучальных устаноў) і ўсёй грамадскасці на праблему бежанцаў. Па словах прадстаўніка УВКБ ААН у Беларусі Іллі Тадаровіча, прытулку ў нашай краіне шукаюць каля 2 500 чалавек, афіцыйны ж статус бежанца мае 750 чалавек.

Пошук прыстанішча — гэта не станоўчая з'ява ў сучасным грамадстве. З гэтым згаджаюцца і беларускія ўлады, і прадстаўнікі міжнародных арганізацый. Апошнія вельмі высока цэняць намаганні Беларусі ў імкненні будаваць цывілізаваныя адносіны і сучасны падыход да бежанцаў як катэгорыі насельніцтва ў цэлым і кожнага з гэтых людзей паасобку.

І асабліва заўважаюць намаганні ў галіне фарміравання грамадскай думкі. Конкурс плакатаў — яшчэ адно сведчанне гэтага. Маладыя людзі малююць розныя сюжэты, але галоўная думка іх адна — "Паглядзі на свет вачыма бежанцаў". Цікава, што плакаты на конкурс дасылалі студэнты з самых розных беларускіх гарадоў і мястэчак. Пераможцай жа стала Эльміра Мухтарава, якая вучыцца ў Гомельскім мастацкім вучылішчы і прадставіла на конкурс шчымлівы ў сваёй трагічнасці плакат "Чалавек без дома... што дрэва без зямлі", на якім жанчына-дрэва адрываецца ад зямлі і ляціць... Куды яна ляціць, не ведае ніхто. Шлях чалавека, які вымушаны пакінуць сваю радзіму, каб выратаваць жыццё, можа прывесці як да пагібелі, так і да таго, што намалявалі пераможцы намінацыі "Лепшы плакат" Арман Аўжанаў і Юлія Кубарава ("Бежанцы" і "Бежанцы... яны мараць пра шчасце").

Конкурс плаката не прэтэндаваў вылучыць нешта звышвысокамастацкае ў сучасным плакаце, але, хочацца паўтарыць услед за прафесарам Салеевым, што ён каштоўны імпульсам чалавечага суперажывання і здольнасцю зусім яшчэ маладых людзей спачуваць тым, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Лепшыя работы, прадстаўленыя на конкурс плануецца выкарыстаць у Мінску ў якасці бігбордаў і для сацыяльнай рэкламы ў грамадскім транспарце. У хуткім часе ў Мінску таксама з'явяцца тралейбусы, на якіх будуць плакаты на тэму "Бежанцы і мы".

Алена СПАСЮК.

Дом нацыянальных культур узводзіцца ў Віцебску

Згодна з адпаведным рашэннем Віцебскага гарвыканкама, у горадзе ствараюць Цэнтр нацыянальных культур, які стане агульным утульным домам для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей.

Пакуль што гарадскі цэнтр культуры ўзяў пад сваю апеку грамадскія аб'яднанні яўрэяў, немцаў, украінцаў, рускіх. Яны праводзяць у ГЦК канцэрты, розныя творчыя акцыі. У гэтым ім дапамагаюць два штатныя супрацоўнікі Цэнтра нацыянальных культур. Але ж свайго памяшкання ў прадстаўнікоў дыяспар пакуль што няма. Кіраўнікі мясцовых уладаў абяцаюць вырашыць гэту праблему ў бліжэйшы час. І тады з'явіцца магчымасць адкрыць нацыянальныя бібліятэкі, запрашаць у госці прадстаўнікоў розных краін. Дарэчы, актывісты спадзяюцца на дапамогу з-за мяжы.

І такія прыклады ўжо ёсць: дзякуючы падтрымцы польскага боку, у свой час у Віцебску з'явіўся Дом польскі. Тут часта бываюць польскія дыпламаты і прадстаўнікі касцёла. Актыўнай міжнароднай дзейнасцю займаецца "Віцебскі англійскі цэнтр", якому вось ужо дзесяць гадоў. Гэта грамадская арганізацыя аб'ядноўвае ўсіх, хто вывучае і размаўляе на англійскай мове. У бібліятэцы англійскага цэнтра больш за дзве тысячы чытачоў, якія бясплатна могуць пачытаць дзесяткі тысяч кніг на англійскай мове.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, "Зв".

Шматгалоссе

"Беларусь шматнацыянальная"

Так называецца прыгожы і змястоўны буклет-даведнік, выпушчаны нядаўна выдавецтвам "Рыфтур" у Мінску. Фота Сяргея Плыткевіча, складанне і тэкст Ларысы Міхальчук. Выданне падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы Офіса АБСЕ ў Мінску, каардынатар праекта ад гэтай арганізацыі — Вадзім Целін, ад Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей — Ніна Ходар. У ім упершыню папулярна расказваецца пра гісторыю, традыцыі, святы, кухню тых народаў, якія заснавалі ў нашай краіне свае аб'яднанні.

Галоўнай мэтай было паказаць, што Беларусь — шматнацыянальнае грамадства, цікавае этнічнай адметнасцю кожнага народа, які тут пражывае, што гэтыя народы маюць роўныя правы з усімі грамадзянамі і могуць развіваць свае культуры.

На вокладку буклета вынесены словы класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы: "...Усе роўныя перад дзяржаўнай уладай, усе роўныя перад правам і законам, усе вольна развіваюць сваю нацыянальную культуру і самабытнасць, кіруючыся ў сваёй грамадзянскай працы дабрабытам агульнай Бацькаўшчыны Беларусі".

Рэгіна ГАМЗОВА

Праведнікі народаў свету

Высакароднасць памяці

У Ізраільскім культурна-інфармацыйным цэнтры ўшаноўвалі праведнікаў народаў свету

На сцяне гонару ў музеі Яд-Вашэм у Ізраілі стала больш на дзевяць імён беларусаў, якія, рызыкуючы сваім жыццём у гады Вялікай Айчыннай вайны, выратоўвалі яўрэяў. Пасол Ізраіля ў Беларусі Зееў Бен-Арые ўручаў ім памятныя медалі. Адкрываючы ўрачыстасць, ізраільскі дыпламат заўважыў, што ўжо больш за 550 жыхарам Беларусі прысвоена званне "Праведнік народаў свету", але кожны год з'яўляюцца новыя імёны гэтых высакародных людзей. Побач з дыпламатам на століку ляжалі 9 медалёў і ганаровых дыпломаў па колькасці новых імён. 7 з іх былі адзначаны пасмяротна...

Хаміцэвіч Ганна, дай Бог ёй доўгія гады, зараз жыве. Яе родных — Хаміцэвічаў Рыгора і Пятра — ўжо няма з намі... Рашэннем спецыяльнай камісіі ізраільскага мемарыяльнага комплексу Яд-Вашэм усім траім прысвоена высокае званне "Праведнікаў народаў свету" за ратаванне Браніславы Турок, якой у той час было 17 гадоў. Фашысты расстралялі бацьку Браніславы, павесілі маці. Саму дзяўчыну, дзякуючы сям'і Хаміцэвічаў, удалося выратаваць. У зале прысутнічала дачка выратаванай жанчыны.

Жыве яшчэ і Кацярына Нявінская, але па стану здароўя не змагла прысутнічаць на ўручэнні ўзнагарод. Гэта мужная жанчына выратавала дваіх дзяцей — мінчан Марка і Інэсу Бусловічаў. Калі ў мінскім гета пайшлі чуткі аб акцыі знішчэння, якую нацысты запланавалі на 7 лістапада 1941 года, маці Марка і Інэсы звярнулася за дапамогай да сваёй сяброўкі Кацярыны Нявінскай, і тая схавала дзяцей.

Калі фашысты знішчылі ў сакавіку 1942 года гета ў гарадку Слаўнае Віцебскай вобласці, Ядвіга Магід згубіла там бацькоў і дваіх брытоў. Ёй удалося збегчы. Два месяцы яна блукала па лесе, пакуль не прыйшла ў вёску Казечына, і там яе прыняла сям'я Хлусевічаў. Сустрэдзям Ядвігу прадставілі як пляменніцу Пелагеі, а калі былі аблавы, хавалі яе ў падвале ці на гары. Памяты медаль і дыплом былі ўручаны дачцы — Хлусевіч Маргарыце Лукінічне, так як яе бацькоў ужо няма жывых. На ўрачыстасці прысутнічала выратаваная Магід Ядвіга Лаўраўна.

У кожнай з расказаных на гэтым вечары памяці гісторый прысутнічае з аднаго боку — мужнасць і спачуванне, а з другога — вечная ўдзячнасць за подзвіг.

Калі прыйшла вайна, яўрэйскі хлопчык Уладзімір Свярдлоў быў дзіцячым летнім лагеры пад Брэстам. Гэты лагер пры фашыстах стаў дзіцячым домам, а яўрэйскіх дзяцей, у адрозненні ад іншых, прымушалі выконваць катаржныя работы. 2 красавіка 1942 года фашысты забілі ўсіх яўрэйскіх дзяцей, і толькі Валодзю ўдалося збегчы. Схуднелага, абяссіленага Уладзіміра выратавала Аляксандра Звоннік. Яна прадставіла ўсім Уладзіміра як свайго пляменніка і глядзела за ім, як за сынам. Уладзімір да канца яе жыцця зваў Аляксандру мамай. Узнагарода была ўручана ўнучцы Аляксандры Звоннік. А Уладзімір Свярдлоў расчуліўся ад успамінаў і дзякаваў беларускі народ за дабрыню.

Па словах ізраільскага пасла, свет, на жаль, не стаў больш гуманным, і тым важней, каб людзі ведалі імёны тых, хто рызыкаваў сабой дзеля ратавання сыноў іншага народа.

Таццяна КУВАРЫНА

Аўгустоўскі канал прапануецца ўнесці ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА

З намеснікам начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ігарам ЧАРНЯЎСКІМ гутарыць наш карэспандэнт Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

— Калі мы гаворым пра выкарыстанне Аўгустоўскага канала, то перш за ўсё маецца на ўвазе водны турызм?

— Гэты канал звязвае басейны Віслы і Нёмана. А праз басейн Нёмана і Прыпяці можна выйсці ў Дняпроўскі басейн далей, праз Бярэзінскую водную сістэму — у Заходнедзвінскі басейн. Зараз прапрацоўваецца ідэя воднага турызму па гэтых маршрутах у Польшчы і ў нашай краіне. Польскі бок мае ўжо вопыт арганізацыі воднага турызму ў зоне Аўгустоўскага канала і на прылеглых азёрах і рэках — мы будзем яго выкарыстоўваць.

— Паколькі Аўгустоўскі канал з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры, то ў чым асаблівасці яго рэканструкцыі?

— Пры рэканструкцыі гэтага аб'екта ў першую чаргу звяртаем увагу на аўтэнтычнасць матэрыялаў, аўтэнтычнасць аўтарскай задумы, дапасаванне самога канала да прыроднага атачэння. Гэтыя тры моманты, надзвычай важныя ў аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны, якія прадстаўляюцца ў Спіс сусветнай спадчыны. На гэта звяртаюць увагу ў першую чаргу эксперты ЮНЕСКА.

— Калі эксперты ЮНЕСКА знаёміліся з Аўгустоўскім каналам у яго беларускай частцы?

— У кастрычніку 2003 года яны знаёміліся з Аўгустоўскім каналам і з іншымі аб'ектамі. Калі мы паказвалі канал, нам трэба было пачуць іх меркаванне. Эксперты адназначна ўказалі на тое, што гэты аб'ект мае магчымасць быць разгледжаным Цэнтрам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, а потым і Камітэтам сусветнай спадчыны для прыняцця канчатковага рашэння. Яны падкрэслілі, што работы на канале павінны ўлічваць усе тыя крытэрыі, якія акрэслівае ЮНЕСКА.

— У чым каштоўнасць Аўгустоўскага канала, што яго так высока ацанілі эксперты ЮНЕСКА, і як ён можа яшчэ выкарыстоўвацца пасля рэканструкцыі?

— Як польская частка канала, так і беларуская знаходзіцца ва ўнікальным прыродным атачэнні. У Польшчы ёсць два нацыянальныя паркі, якія з поўдня і з поўначы акружаюць канал, а таксама шэраг прыродаахоўчых аб'ектаў, якія былі ўзяты пад ахову рашэннем мясцовых улад. Гміна Пласка, напрыклад, мае вельмі дакладную праграму дзейнасці ў зоне канала (гэта і турыстычныя наведванні, і работа з моладдзю, гаспадарчая дзейнасць і іншыя). Мы сустракаліся з войтам гэтай гміны, і ён нам патлумачыў, што ў іх ёсць пэўныя планы рэабілітацыі дзяцей, якія маюць фізічныя абмежаванні. Кантакты з жывёламі, жыццё ў прыродным асяроддзі спрыяе гэтаму. Такая дзейнасць падтрымліваецца дзяржаўнымі датацыямі. Пэўны прыбытак можа прыносіць і турызм. Гэта ўжо недзяржаўныя сродкі, яны, як і дзяржаўныя, плануюцца і ўлічваюцца. Іншыя гміны таксама маюць свае праграмы, але мы пабывалі менавіта ў гміне Пласка, пераймаючы вопыт польскіх калег па выкарыстанні Аўгустоўскага канала. На нашым баку ёсць шэраг батанічных заказнікаў у зоне канала, тут можа быць таксама ландшафтны запаведнік.

— Што вы можаце сказаць пра работы, якія вядуцца зараз на Аўгустоўскім канале, тэрміны іх выканання?

— Работы на Аўгустоўскім канале вядуцца з першай паловы 2004-га, у 2006 годзе рэканструкцыя павінна быць завершана. Даследаванне, праектаванне, вытворчасць работ на трасе канала вядуцца адначасова. Спачатку ішлі першачарговыя супрацьаварыйныя работы, расчышчалася дзікая расліннасць, якая вырасла ў зоне канала і разбурала канструкцыі шлюзаў. Састарэлыя дзікарослыя дрэвы падалі ў канал, стваравочы штучныя плаціны, што таксама трэба было ліквідоўваць. На гідразбудаваннях работы вядуцца літаральна з лёта. У гэтым — станоўчы бок, бо рэканструкцыя не расцягваецца на гады, хаця ёсць і складанасці.

Наступны этап — асваенне тэрыторыі канала. Тут задзейнічана Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства прыродных рэсурсаў, Міністэрства культуры. Толькі пры аб'яднанні сумесных намаганняў магчыма асіліць гэтую грандыёзную задачу. Ужо прайшла ўзгадненне праектная дакументацыя Генеральнага плана канала, схема тэрытарыяльнай арганізацыі зоны канала і сацыяльнага развіцця прылеглых тэрыторый, ідзе больш дэталёвае праектаванне розных частак канала. Дзесьці з'явяцца вытворчыя зоны, дзесьці турыстычныя, зоны адпачынку. Гэта ўсё трэба падрабязна прапрацаваць, адлюстраваць у праектнай дакументацыі, бо Аўгустоўскі канал, як аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны, мае ступень дапушчальных нагрузак. Калі будзе замнога наведвальнікаў, турыстаў або пачнецца празмерная гаспадарчая дзейнасць у зоне канала, шмат транспарту — канал ад гэтага будзе толькі цярпець, разбурацца, проста перастане быць прыцягальным. Вельмі важна ўсё гэта прадугледзець на стадыі падрыхтоўкі праектных матэрыялаў.

— Скажыце, калі ласка, наколькі сам ход работ, іх адпаведнасць статусу помніка кантралюецца вашым упраўленнем, бо менавіта ж ваша арганізацыя прапанавала ўнесці яго ў Спіс сусветнай спадчыны?

— Кантроль ажыццяўляецца непасрэдна ўпраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, а ў цэлым — Міністэрствам культуры як дзяржаўным органам аховы спадчыны, вызначаным у Законе аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Ёсць шэраг нарматыўных актаў, якія рэгламентуюць даследчую, пошукавую і праектную дзейнасць, таму мы адсочваем усе працэсы, якія адбываюцца на канале, кіруючыся наяўнай заканадаўчай базай. Узгадняецца праектная дакументацыя ў Міністэрстве культуры, прычым, аб'екты такога статуса выносяцца на разгляд навукова-метадычнай рады. На пэўныя віды работ мы даём дазвол, таму і праз выдачу дазволаў, адсочванне іх рэалізацыі таксама ажыццяўляецца кантроль.

Больш таго, мы працуем у цесным кантакце з праектнымі арганізацыямі. Гэта генеральны праекціроўшчык — Інстытут "Белгіправодгас", на субпадрадзе ў яго працуе Беларускі навукова-даследчы інстытут горадабудаўніцтва, размешчаны ў Мінску, Архітэктурна-рэстаўрацыйнае бюро архітэктара Шайко ў Гродне. Цесны кантакт маем з навуковым кіраўніком аб'екта — гэта вопытны архітэктар і адміністратар Анатоль Пархута. Яго вялікія веды па каналу ўвогуле (беларускай і польскай частак) дапамагаюць у працы, ён вельмі строга выстаўляе патрабаванні, якія дыктуюцца нашым заканадаўствам. З заказчыкам на выкананне работ — абласным унітарным прадпрыемствам "Упраўленне капітальнага будаўніцтва Гродзенскага аблвыканкама" — у нас таксама цесныя кантакты. І з унітарным прадпрыемствам "Гроднааблмеліводгас", якое ўпраўляе гэтым каналам. Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама з'яўляецца разам з Міністэрствам культуры органам дзяржаўнага кіравання сферы аховы спадчыны, таму і з гэтым упраўленнем мы працуем разам. Такая шырокая гама кантактаў і заканадаўчая база дазваляюць прасочваць усе працэсы на канале. Мы маем некалькі водных сістэм у Беларусі, але Аўгустоўскі канал — першы і найбольш складаны аб'ект даўжынёй каля 20 кіламетраў, ён найбольш захаваўся, мае шмат аўтэнтычных элементаў, таму праца з ім адказная і складаная.



НА ЗДЫМКАХ: навуковы кіраўнік Аўгустоўскага канала Анатоль ПАРХУТА ацэньвае якасць работ; ідуць работы на Аўгустоўскім канале.

Фота Ігара ЧАРНЯЎСКАГА.

Перспектывы

У Беларусі да канца 2006 года ўсе гасцініцы будуць класіфікаваны

На працягу 2006 года плануецца правесці на добраахвотнай аснове сертыфікацыю і класіфікацыю гасцініц. Такое рашэнне змяшчаецца ў плане мерапрыемстваў па развіццю гасцінічнай гаспадаркі рэспублікі, які зацверджаны ўрадам. Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення турызму Міністэрства спорту і турызму Віктар Янкавенка.

Як ён адзначыў, сертыфікацыя гасцініцы і прысваенне ёй пэўнага класа — галоўная ўмова для прываблівання замежных турыстаў. Між тым, у Беларусі афіцыйна прызнаны "зоркавымі" толькі 10 гасцініц, з іх адна — 4-зоркавая, астатнія маюць статус трох зорак.

План закранае таксама другую актуальную для развіцця ўязнога турызму праблему — так званую цэнавую дыскрымінацыю ў гасцініцах краіны, наяўнасць рознага кошту за аднолькавыя паслугі для грамадзян Беларусі, краін СНД і замежных грамадзян. Адпаведна плану, міністэрствам эканомікі, фінансаў, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, замежных спраў, спорту і турызму, а таксама аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму даручана ўнесці ў Савет Міністраў прапановы аб увядзенні адзіных тарыфаў на гасцінічныя паслугі. Як адзначыў Віктар Янкавенка, Міністэрства спорту і турызму будзе адстойваць пазіцыю ўзважанага цэнаўтварэння. Ён сказаў, што нельга дапусціць, "каб з увядзеннем адзінага тарыфу цэны для ўсіх катэгорый грамадзян "узляцелі" да ўзроўню, які быў для іншаземцаў".

Да снежня бягучага года, адпаведна плану, будуць распрацаваны і ўнесены на зацвярджэнне ўраду адзіныя для Беларусі правілы прадстаўлення гасцінічных паслуг. У іх будзе распісана сістэма браніравання месцаў, час разліку за знаходжанне ў гасцініцы, а таксама рэгістрацыя замежных гасцей. Акрамя таго, запланавана прымяненне больш гібкай сістэмы скідак на тарыфы па аказанню паслуг гасцініцай. Напрыклад, для турысцкіх груп, па выхадных днях, для студэнтаў і школьнікаў у час канікул, у залежнасці ад працягласці пражывання.

Гасцінічны фонд нашай краіны, як прадугледжана планам, павінен пашырацца. Будуць пабудаваны новыя гасцініцы, у большасці сярэдняга эканамічнага класа (стандарта 2-3 зоркі), у гарадах і буйных населеных пунктах. Плануецца ўзвядзенне матэляў і невялікіх гасцініц на трасах найбольш запатрабаваных турысцкіх маршрутаў, будаўніцтва аўтакемпінгаў з неабходным абсталяваннем для прыёму турыстычных аўтобусаў. Да сярэдзіны гэтага года аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму даручана зрабіць пералік зямельных надзелаў пад будаўніцтва аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры. Затым апублікаваць яго ў сродках масавай інфармацыі і аб'явіць конкурс на іх забудову.

На думку Віктара Янкавенкі, выкананне плана дазволіць значна "ажывіць" турыстычныя патокі.

Алег Рудакоў — беларус з Іркуцка

Сярод кіраўнікоў беларускіх суполак, таварыстваў, аб'яднанняў у Расійскай Федэрацыі шмат неардынарных асоб. У іх ліку Алег Рудакоў, які ў 1996 годзе стварыў Іркуцкае таварыства імя Яна Чэрскага. Нават па нашых публікацыях чытачы маюць уяўленне пра тую цікавую працу, якую праводзіць таварыства, але пра яго кіраўніка мы пісалі недастаткова — кожны свой прыезд на радзіму Алег плануе настолькі шчыльна па часе, што ніяк не ўдавалася пагутарыць з ім грунтоўна. Спадзяюся, што гэта інтэрв'ю раскрые гэтага цудоўнага чалавека ва ўсёй прыгажосці яго душы і памкненняў. Ніколі б не падумала, што ён былы вайсковец, бо па складу характару і дзейнасці — сапраўдны гуманітарый.

— З роднай вёскі Бяздзедавічы Полацкага раёна Віцебскай вобласці, дзе нарадзіўся ў 1968 годзе, я ў 1985 годзе з'ехаў у Цюмень, каб паступіць у вайсковае вучылішча. Скончыўшы Цюменскае вышэйшае інжынерна-каманднае вучылішча, набыў спецыяльнасць сапёра і быў накіраваны ў Каракумы, потым служыў у Чыце, зноў вярнуўся ў Іркуцк. І што цікава — трапіў на службу ў Віцебскую гвардзейскую дывізію ракетных войскаў, якая ў час Вялікай Айчыннай вайны вызваляла Віцебск і Полацк. Мне было гэта так дзіўна, што я, палачанін, служу ў такой дывізіі. З вялікай цікавасцю разглядаў стэнд, які паказваў яе баявы шлях, сфатаграфаваўся ля яго і адаслаў бацькам, сябрам фатаграфіі.

— А калі з'явілася ўпершыню адчуванне, што Радзіма — гэта Беларусь, а не СССР?

— Некалькі выдатнікаў вучобы з нашай школы пасля заканчэння 7-га класа паехалі ў Ленінград, і ў гасцініцы побач у пакоі жылі дзеці з Эстоніі. Калі збіраліся ў сталовую, яны дэманстратыўна гаварылі паміж сабой па-эстонску, паглядалі на нас і смяяліся. Нам стала няёмка, і я падгаварыў хлопцаў і дзяўчат гаварыць па-беларуску. Эстонцы прыціхлі і пазіраюць на нас. Тады іх дзяўчынка-лідэр падышла і спыталася, хто мы і на якой мове размаўляем. Я з годнасцю адказаў, што мы беларусы і прыехалі з Полацка, гаворым па-беларуску. Яна здзівілася, што наша мова зусім не такая, як руская. Потым мы нават пасябравалі.

У вучылішчы я адзін чытаў кнігі па-беларуску, хоць беларусы там таксама служылі. Можна было іх спакойна пакідаць на тумбачцы ў казарме, дзе было 120 чалавек — ніхто не возьме. Нейкі такі ўнутраны гонар за тое, што я беларус, у мяне заўсёды быў.

У 1991 годзе, калі разваліўся Савецкі Саюз, вельмі хацеў патрапіць у беларускую армію, але вымушаны быў звольніцца па стану здароўя. У 1994 годзе паступіў адразу ў дзве навучальныя ўстановы — гістарычны факультэт Іркуцкага дзяржаўнага універсітэта і Іркуцкі тэхнічны універсітэт на спецыяльнасць "Менеджмент". Пачаў працаваць у прыватнай фірме.

— А як і калі захапіла беларуская справа?

— Штуршком паслужыла тое, што ў 1995 годзе мяне запрасілі на з'езд Таварыства беларускай мовы ў Мінск. У перапынку да мяне падыходзіла шмат людзей, пыталіся, колькі беларусаў у Іркуцку і ці ведаю я, хто такі Ян Чэрскі, наш зямляк. Не ведаў тады адказу на гэтыя пытанні, але хацеў даведацца і даў аб'яву ў мясцовай газеце, што шукаю беларусаў з тым, каб сустракацца разам, стварыць таварыства. У лютым 1996 года мы ўпершыню сабраліся ў кабінеце знакамітага на ўсю Іркуцкую вобласць нейрахірурга Анатоля Рэута. Сам ён родам са Слуцка. Нас было тады ўсяго пяць чалавек: я, Анатоль Ануфрыевіч, Людміла Чаканнікава — артыстка музычнага тэатра, Васіль Кісялёў — начальнік цэха скурзавода, Надзея Банчук — прапаршчык. Усе выказалі тугу па Радзіме, жаданне сустракацца. Я прапанаваў стварыць суполку, заняцца пошукам землякоў.

31 мая мы правялі наш першы з'езд, прынялі эмблему, вызначылі асноўныя накірункі дзейнасці, а статут прынялі на другім з'ездзе, бо патрэбен быў час на яго распрацоўку. Аказалася, што ў Іркуцку шмат беларусаў, некаторыя не былі на радзіме 15-20 гадоў. Таццяна Бізікава не была ў Беларусі 13 гадоў. Дзякуючы нам з'ездзіла на Радзіму.

— Увогуле вы працуеце вельмі цікава і мэтанакіравана, асабліва ўражваюць вашы поспехі ў прыцягненні дзяцей і моладзі ў таварыства.

— Кожны год ладзім Купалле (да 500 чалавек збіраецца, гэта галоўнае для нас свята, рыхтуемся да яго ўвесь год — дзяўчаты шыюць строі самі і вышываюць), Каляды, Дзяды, Гуканне вясны. Пяць гадоў назад стварылі маладзёжны клуб "Крывічы", усе ўдзельнікі якога нарадзіліся ў Сібіры і цьмяна ўяўлялі сабе, што такое Беларусь, але хацелі даведацца, хацелі вывучыць беларускую мову. І мы пачалі працаваць, пачалі развучваць песні, гульні, мову, чытаць кнігі пра Беларусь. Многія хацелі б пабываць на радзіме сваіх продкаў. У іх ёсць свае амбіцыі: дзякуючы суполцы, яны ўдзельнічаюць як яе прадстаўнікі ў розных маладзёжных канферэнцыях, праяўляюць сябе, вучацца пісаць артыкулы, такім чынам развіваюцца і становяцца лідэрамі.

Адна з такіх лідэраў — Алена Сіпакова — з 4-га пакалення беларусаў-перасяленцаў: ужо яе бабуля, маці і яна нарадзіліся тут, але бабуля расла ў сям'і, дзе захоўвалася беларуская мова і традыцыі, таму ад яе яшчэ можна шмат даведацца. Алена засвоіла вышыўку з беларускімі арнаментамі, вучыць цяпер дзяцей. Яна вядзе заняткі па ўжытковаму мастацтву ў клубе "Зярнятка", удзельніца нашага фальклорнага гурту "Ленушка". Рэпертуар гэтага гурту цалкам складаецца з фальклору, запісанага ад беларусаў Прыбайкалля.

Мы вядзём працу па 22 накірунках. І цяпер самая галоўная задача — сфарміраваць каманду лідэраў, якая б развівала гэтыя накірункі. Яны ёсць і самааддана працуюць, але трэба, каб былі больш смелымі і самастойнымі. Не кожны ініцыятыўны чалавек становіцца лідэрам. Напрыклад, ёсць у нас адзін актыўны хлопец — Віктар Сінкевіч, ён з'яўляецца сябрам рады Іркуцкага гарадскога аддзялення нашага таварыства. Прапанаваў стварыць каманду КВН і назваць яе "Дранік" (дабравольная рэспектабельная альтэрнатыўная іркуцкая каманда). Ідэя добрая, назва таксама, але справа не пайшла, бо ён аспірант, часу няма, і ўсё заглухла.

— Тым не менш, вам удаецца зрабіць шмат...

— З 2002 года выпускаем свае маленькія кішэнныя каляндарыкі з беларускімі назвамі месяцаў і дзён тыдня (такім чынам лягчэй запомніць гэтыя словы). На першым каляндарыку — фота актывістаў маладзёжнага клуба "Крывічы" ў нацыянальных строях на Байкале, на другім — дзяўчаты на Купаллі, на трэцім — дзіцячы гурток у час Каляд на чацвёртым — клуб "Зярнятка" ў час заняткаў. Мы звычайна аб'яўляем конкурс на лепшы фотаздымак для каляндарыка.

— А якога ўзросту дзеці ходзяць у клуб?

— У клубе "Зярнятка", створаным у 2004 годзе, займаюцца дзеці з 6 да 14 гадоў. Пакуль тут 15 дзяцей, створана 4 секцыі: гісторыі беларускага народа, беларускае слова (мова і літаратура), нацыянальныя рамёствы (вышыўка, выраб адзення, падрыхтоўка да абрадавых святаў), фальклорная. Заняткі праводзяцца кожную суботу ў сядзібе Іркуцкага таварыства беларускай культуры. Вяду іх я і Алена Сіпакова.

— Значыцца, маеце памяшканне для сваёй працы?

— Маем сядзібу ў цэнтры горада. Безумоўна, за яе трэба плаціць (арэнда, камунальныя паслугі), таму збіраем складкі па 100 рублёў на год. Яны не з'яўляюцца абавязковымі — хто не можа, той не плаціць, а хто можа ахвяраваць больш, дае больш. Мы вельмі ўдзячныя Уладзіміру Кузьмічу Якавенку: кожны месяц ён ахвяруе пяць тысяч расійскіх рублёў на выданне нашай газеты "Маланка" (з іх дзве тысячы расходуюцца на камунальныя паслугі). Гэты цудоўны чалавек з'яўляецца маім намеснікам, сябрам абласной рады, і яго парады вельмі слушныя, неабходныя. Уладзімір Кузьміч — былы віцэ-губернатар Іркуцкай вобласці, старшыня савета дырэктараў "Байкалрасбанк". А яго лёс варты быць увекавечаным у кнізе або кінафільме.

— Раскажыце, калі ласка, тое, што ведаеце пра яго.

— Уладзімір Якавенка — сын вайскоўца. Яго бацька — беларус, быў ваенным лётчыкам. Калі пачалася вайна, яго прызвалі на фронт. Жонцы ваеннага было небяспечна заставацца пад акупацыяй, і яна пайшла з сынам на ўсход. Трапіла ў партызанскі атрад, які выходзіў з акружэння, і загінула. Хлопчык гадаваўся ў інтэрнаце. Пасля вайны бацька яго знайшоў. Праўда, як ваенны часта мяняў месца жыхарства, яны з'ехалі з Беларусі. Ужо ў сталым узросце Уладзімір Кузьміч наведаў магілу маці і інтэрнат, дзе гадаваўся. Прыходзіць у хату былога выхавацеля інтэрната, а той, ужо стары дзядок, падымае галаву і кажа, як быццам толькі ўчора бачыў яго: "О, Валодзька прыйшоў!" Было гэта вельмі дзіўна і радасна для яго.

У свой час у 2000 годзе Уладзімір Кузьміч сам мне патэлефанаваў і сказаў, што хоча ўступіць у таварыства. Ад таго часу падтрымлівае таварыства і сваімі парадамі, і матэрыяльна. Безумоўна, што нам трэба шукаць магчымасці самім зарабляць грошы на нашу дзейнасць. Мы і спрабавалі гэта з самага пачатку стварэння суполкі, калі стварылі Саюз прадпрымальнікаў. Але з гэтага нічога не выйшла. У кожнага свой бізнес, і ўжо наладжаны, аб'яднанне нічога не дало. Затым была ідэя стварыць Беларускі гандлёвы дом — таксама не атрымалася. Увогуле гэта асобная вялікая праца. Маем новыя ідэі эканамічнага характару — стварыць у Іркуцку рэстаран беларускай кухні. Дамовіліся з адміністрацыяй Іркуцкай вобласці, што нам выдзеляць месца. Знайшлі фірму, якая займаецца рэстаранным бізнесам, якая была гатова прафінансаваць гэты праект. Мы ўзялі на сябе абавязкі па аздабленні рэстарана, знайшлі свайго повара і прапануем беларускае меню. Запісваем ад беларусаў Прыбайкалля рэцэпты традыцыйных страў і самі спрабуем іх гатаваць, таму можам прапанаваць некаторыя для рэстарана. Афіцыянткі будуць апранутыя ў беларускія народныя строі. Трэба рабіць таксама рэкламу. Спадзяёмся, што рэстаран будуць наведваць у першую чаргу сябры нашага таварыства. Нейкі невялікі працэнт прыбытку павінен пералічвацца на рахунак нашай арганізацыі. Але пакуль гэтая справа ў стане рэалізацыі.

— Памагай Бог, як кажуць беларусы, каб гэты праект ажыццявіўся і ўсе іншыя вашы планы.

— Я і адказ ведаю: "Казаў Бог, каб і ты памог". А калі сур'ёзна, то нам бы хацелася атрымаць з Беларусі дапамогу вось у якім плане. Мы шмат гадоў вывучаем традыцыйную культуру беларускіх перасяленцаў у Прыбайкаллі, дзе ёсць цэлыя вёскі кампактнага пражывання беларусаў (у кожным раёне — па 10-15). Складаем картатэку, архіў запісаў. Многія людзі падказваюць, дзе жывуць беларусы, і я еду, даследую, прывожу прадметы побыту, якія захаваліся ў гэтых вёсках, народныя строі, вырабы народных майстроў, якіх ужо няма ў жывых. Стварылі экспазіцыю беларускіх рамёстваў у музеі нашага таварыства. Беларусы жывуць у Куйтунскім, Эхрыт-Булагацкім, Баяндаеўскім, Тулунскім, Тайшэцкім, Балаганскім раёне, у горадзе Чаромхава. Тут добра захаваліся народныя традыцыі.

— Ці можна вызначыць, у якіх вёсках перасяленцы якога часу, што іх выгнала з родных мясцін? Памятаюць пра гэта людзі?

— Асноўная вялікая хваля перасяленцаў з'явілася тут каля 100 гадоў таму ў перыяд сталыпінскіх рэформаў. Яны ведаюць гісторыю сваіх продкаў, што сюды перасяліліся, але, на жаль, не заўсёды могуць сказаць, з якіх дакладна мясцін у Беларусі (называюць або толькі губерню, або вёску, таму цяжка вызначыць, але ў асноўным — з Магілёўскай і Гомельскай абласцей).

Дарэчы, мае паездкі і гутаркі з людзьмі маюць працяг: стараюся знайсці маладых энтузіястаў, прыцягваю іх да працы ў таварыстве. Мясцовыя аддзяленні ўжо стварылі ў Балаганскім і Баяндаеўскім раёнах, ёсць яны ў гарадах Чаромхава і Брацку. Наша вобласць вялікая — можа змясціць на сваёй тэрыторыі Беларусь, Украіну, Прыбалтыку разам узятыя, і яшчэ застанецца. Каб працаваць сярод вясковых беларусаў, патрэбны мясцовыя маладыя энергічныя людзі, якія хочуць ведаць свае карані, і мы іх знаходзім. Самая першая вёска, дзе я пабываў, — гэта Тургенеўка Баяндаеўскага раёна, якая створана ў 1909 годзе, затым — вёска Тарнопаль. Там ужо пры школах працуюць маладзёжныя цэнтры "Ручнічок" і "Крыжачок". Моладзь займаецца ў фальклорных студыях.

— Раскажыце пра вашы экспедыцыі, цікавыя знаходкі і сустрэчы.

— Вось цікавы прыклад. Я ўжо знайшоў пяць беларускіх вёсак у Баяндаеўскім раёне — Тургенеўка, Васільеўка, Лідзінск, Шаманка, Талстоўка — і стаў шукаць новыя. Адзін чалавек падказаў, што ў вёсцы Ахіны "гэкаюць", можа, беларусы? Паехаў. Дарога дрэнная. Бачу — на "казле" едуць дзед з бабай, загаварыў і чую ў адказ: "А вы да каго едзеце?" Ну ўсё, адразу чуваць, што беларусы тут! Стаў распытваць, чаму вёска так называецца, расказваюць: "Хадакі спачатку прыйшлі, а за імі тры роды з сем'ямі. Старэйшы з іх і кажа: "Ахінайце тут усё!" А з імі быў інжынер з Іркуцка, ён пачуў незнаёмае слова і так і запісаў назву вёскі — Ахіны. Такіх гісторый шмат.

Але асабліва цікава запісваць песні, абрады, якія захаваліся да нашага часу. Такія старажытныя пласты народнай культуры ў іх! І ў нас з гэтым вялікая праблема: няма спецыялістаў і няма добрай гуказапісваючай апаратуры, добра было б відэакамеру мець, каб зняць тое, што расказваюць і паказваюць, як спяваюць і якія танцы, гульні памятаюць носьбіты традыцыйнай культуры. А яны ж старыя, трэба спяшацца рабіць гэту работу. І вось набыць неабходную апаратуру мы б і хацелі прасіць дапамогі ў Беларусі. Гэта ж наша агульная спадчына, якую трэба сучаснымі тэхнічнымі сродкамі запісаць, пакінуць на памяць будучым пакаленням. Які цудоўны кракавяк паказалі нам у вёсцы Марынінск Заларынскага раёна! А чаго варты Абрад пахавання лягушкі! Ці чулі вы пра такі спосаб выклікання дажджу? А песня "Бяроза караністо тая" — гэта ж проста дыямент!

Мы не толькі збіраем і вывучаем фальклор беларусаў Прыбайкалля, але і пераймаем яго: наш гурт "Ленушка" спявае песні, выконвае танцы сваіх дзядоў і бабуль. Гэтая спадчына мае вялікае выхаваўчае значэнне.

Гутарыла Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

Скарбонка

Галерэя майстроў

"Беларускія мастацкія промыслы" — для вас

Дзяржаўны канцэрн "Беларускія мастацкія промыслы" прапануе ў лагазінах шмат прыгожых і разнастайных вырабаў з прыродных матэрыялаў работы народных майстроў. Мы сёння аздобілі некаторымі з іх старонку "Скарбонкі". Сярод прадпрыемстваў канцэрна вылучаецца навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Скарбніца", створанае ў 1976 годзе. На аснове рэканструкцыі традыцыйных ручных народных тэхналогій тут распрацоўваюцца сучасныя вырабы дэкаратыўна-прыкладнога характару. Гэта традыцыйныя народныя строі (сцэнічныя — для фальклорных ансамбляў, для персанала кафэ і рэстаранаў), такія вырабы ручнога ткацтва, як абрусы, ручнікі, дэкаратыўныя пано і іншыя, вырабы з саломкі, кераміка, роспісы на шкле, тканінах і па дрэву (для афармлення інтэр'ераў розных памяшканняў, сувеніры, падарункі).

Урокі Дзеда Усёведа

Народныя гульні і забавы

Заняткі ў школе закончыліся, але і ў час канікулаў многаму можна навучыцца. Напрыклад, развучыць народныя гульні, танцы ці іншыя забавы.

СКАРАГАВОРКІ

Адна сарока, адна марока, сорак сарок, сорак марок.

Каваль каваў каня, конь каваліо запытом, каваль каню кнутом.

Рабая курка клюе крупы.

Мы бачылі бабра, і сказаў нам бобра, што нам будзе добра.

ЛІЧЫЛКІ

Раз, два, тры, чатыры, пяць, шэсць, сем, восем, дзевяць, дзесяць,

Цар вялеў мяне павесіць. А нядоўга я вісеў: вецер дунуў, я зляцеў.

Ішоў Ціхан па масту, праваліўся ў ваду. Бульк!

Ішла кошка па раялі, наступіла на педалі і запела: — до, рэ, мі, фа, соль, ля, сі, што ўкрала — прынясі. — Я ўкрала каўбасу, заўтра рана прынясу.

Кацілася торба з высокага горба. А ў той торбе хлеб, пшаніца. З кім жадаеш ты жаніцца"?

Пятро, Пятро, падай вядро. Карове — піць, табе жмурыць.

КАРАГОДНАЯ ГУЛЬНЯ "ЯВАР"



Гульня прызначана для дзяцей 8-10 гадоў і старэйшых. Яны выбіраюць дваіх "на вароты". Усе бяруцца за рукі і ходзяць васьмёркай, падымаючы рукі ўгару, каб можна было прайсці. Пры гэтым спяваюць:

Явар, яваравы людзі, што вы тут рабілі?

— Мы рабілі моста на пана староста. Цепычкамі запускалі, аднаго нам астаўлялі. Перша капуста, друга распуста. Перша малявана, друга затрымана.

На слове "затрымана" запыняюць апошняга і пытаюцца: "Ты куды ідзеш — управа ці ўлева"? (або на выбар называюць два розныя колеры, два дрэвы і так далей). Затрыманы ў залежнасці ад адказу становіцца за тым ці іншым "на варотах". Потым дзве групы, якія атрымліваюцца ў выніку апытання, мераюцца сілаю. На гэтым гульня заканчваецца.

ГУЛЬНЯ "У ПІКЕРА"

Пікер — гэта кій, убіты ў зямлю, пры якім стаіць адзін з удзельнікаў гульні са сваім кіем. Усе дзеці таксама з кіямі стаяць воддаль. Па камандзе вартаўніка пікера яны кідаюць свае палкі ў пікер, каб збіць яго. Той, хто стаіць пры пікеры, павінен падняць яго і зноў убіць у зямлю, а сваім кіем даткнуцца да аднаго з атакуючых. Калі гэта яму ўдаецца, той яго замяняе. Пікершчык імкнецца паставіць пікер, а ўсе ўдзельнікі атакуюць яго і стараюцца зноў павалі́ць пікер. Пікершчык абараняе пікер, датыкаючыся сваім кіем да дзяцей. Але важна, каб ён даткнуўся ў час, калі пікер убіты ў зямлю.

КАЛЫХАНКІ



А-а, а-а, каткі два, шэры,
белы — абадва.
Адзін лысы, ловіць мышы,
другі буры, ловіць шчуры.
Адзін пайшоў па капусце,
носіць Свеце сон у хусце.
Апсік, каток, на кірмаш,
а Светачка, спацькі ляж.

***



Ходзіць певень па капусце,
носіць сон у белай хусце,
Усенькім дзецям прадаваў,
а Ганульцы дарма даў.

***



А-а, а-а, люлі, спі, сыночак
міленькі, галубочак сівенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
а я буду калыхаць.
Нашто, вецер, ты гудзеш,
спаць Міхаську не даеш?
Спі, сыночку міленькі, ой
да люлі, люленькі...
Успомніш матку ты сваю,
як цябе люляла,
Як табе у ноч не раз песню
я спявала.

ЗАБАЎЛЯНКІ ДЛЯ МАЛЫХ

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Трэба ножку падкаваць,
Каб умела танцаваць.

Тра-та-та, тра-та-та,
Выйшла кошка за ката,
За ката катовіча,
За Пятра Пятровіча.

Вадзічка, вадзічка,
Памый маё лічка,
Каб вочкі блішчэлі,
Каб шчочкі чырванелі,
Каб смяяўся раток,
Каб кусаўся зубок.

Каза мая белая
Па гародзе бегала,
Аб'елася лебяды —
Скок, брык да вады.
Пераскочыла масток,
Адарвала свой хвасток.
Пайшла каза бядуючы,
А дзед — пугай лупцуючы:
— Го-го-го, мая каза,
Го-го-го, белая,
Але ж уся аблуплена,
За тры грошы куплена.

Ідзе каза рагатая,
Бадзе дзіця пузатае:
Закалю цябе рагамі,
Затапчу цябе нагамі,
Хвосцікам замяту,
Закалю, закалю, закалю.

Падрыхтавала Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

Планета з імем Лілія

Майстрыха з вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёну Лілія Зарэцкая вышыла генеалагічнае дрэва свайго роду

ДОМ, ШТО ПАДОБНЫ НА МУЗЕЙ

Лілія Зарэцкая вельмі любіць гасцей. Калі на парозе яе маленькай кватэркі нечакана з'явілася журналістка, жанчына ўзрадавалася, заваркавала, быццам галубка, перамешваючы ў сваёй гаворцы рускія, польскія, беларускія, а таксама "самаробныя", створаныя ёй самой новыя, надта каларытныя і "смачныя" слоўцы. Вядомая справа, заходніца...

— Сонейка, прашу ласкава, боцікі не здымайце. Халаднавата тут у нас. А тэчку кіньце на крэсліца. Спачатку пад'ямо з дарогі, а потым усё астатняе...

На "лобным" месцы ў "залі", на печцы, пакрытай керамічнай пліткай, размясцілася галоўная "каштоўнасць" гэтага дома, якая і прывяла мяне сюды — нядаўні "твор" вядомай беларускай вышывальшчыцы пад назвай "Дрэва жыцця". Другога месца размясціць сваё дзецішча ў гаспадыні не знайшлося — кожны сантыметр плошчы ўжо заняты. На адной сцяне — шыкоўны, метры тры на чатыры, дыван, вышыты крыжыкам, побач з печкай — здымкі бацькоў, дзяцей і ўнукаў, над тэлевізарам — яшчэ адзін дыванок, невялічкі, "яшчэ цёпленькі", як кажа гаспадыня, — яна яго толькі перад маім прыездам скончыла. Сама не можа наглядзецца: па блакітнай вадзе плаваюць лебедзі, над камышамі пралятаюць матылі і стракозы, дзеці ловяць вудай рыбу. Вось ён, рай!

У спальні — сапраўдны музей народнай творчасці. І дываны, і падушкі розных памераў... Гаспадыня кажа, што толькі падушак яна зрабіла каля 60. Для кожнай сама наскубла пер'я. Амаль усе падушкі параздавала родным ці знаёмым... Дываноў розных памераў вышыла болей за дзесятак. А ўжо розных сурвэтачак і абрусаў — нялічана. Але вось "Дрэва жыцця", відавочна, рэч унікальная. І яна, бадай, прэтэндуе на тое, каб стаць галоўным і самым важным яе "творам". Як кажа Лілія Радзівонаўна, гэтая праца яшчэ больш зблізіла і згуртавала ўсю іх вялікую сям'ю. Вечарамі да яе забягаюць унукі, дзеці, сёстры, усаджваюцца каля "Дрэва роду", адшуквацюць там сярод густых галінак "свой" лісточак.

Работа над дрэвам для яе была звычная. Аднак даводзілася ўдакладняць чыесьці гады жыцця: жанчына рассылала па 20-30 пісьмаў у розныя адрасы, дзе маглі адказаць на яе запыты. Але большасць родзічаў былі мясцовыя, "папрыліпалі", як кажа яна, да гэтай зямлі з нараджэння і засталіся тут назаўсёды.

ГАНАРАЦЦА СВАІМ РОДАМ

— Калі мама рабіла "Дрэва жыцця", мы ўсе ёй дапамагалі, чым маглі, — расказвае дачка Лілії Радзівонаўны Таццяна (яна выкладае маляванне і гісторыю мастацтваў у навасёлкаўскай школе). Мая дачка Наталля малявала літары подпісу, я рабіла аздобу, адпрасоўвала. Першапачаткова на "Дрэве роду" з'явіліся 87 чалавек, 14 прозвішчаў, якія прадстаўлялі шэсць пакаленняў роду. Пазней адбыліся перамены: у Лілії Радзівонаўны і яе сястры нарадзілася па ўнуку, а двое са старэйшых родзічаў памерлі. Яна ўнесла папраўкі.

— Старэйшы, пра каго захавалася памяць — Лапачонак Андрэй, мой прадзед, нарадзіўся ў 1830 годзе ў вёсцы Макаршчына Пастаўскага раёна, — тлумачыць Лілія Радзівонаўна, — дзядуля і бацька таксама адтуль. Першая жонка дзеда звалася Ізабела, другая — Магдалена. Я думаю, што біблейскія імёны даваліся ім веруючымі бацькамі. Мяне ж таксама з нараджэння называлі Лія, а потым стала — Лілія, больш па-сучаснаму. Магдалена нарадзіла трох дзетак — майго тату, цётку Марыю і дзядзьку Пятра. Апошні без вестак загінуў на вайне, пазней яго магілу знайшлі ў Польшчы. Дзяцей Пятра выхоўвала Марыя. Яна замужам не была. Дзеці Пятра ўсе павыходзілі ў людзі, але раз'ехаліся па свеце. Аднаго занесла аж у Североморск. Тым не менш, усе мы перапісваемся, роднімся, збіраемся.

Большасць прадстаўнікоў іх роду, як кажа Лілія Радзівонаўна, людзі простыя, ад зямлі. Бацька Лілії Зарэцкай, напрыклад, быў пастухом, працаваў на ферме. У іх сям'і нарадзілася пяць дачок і адзін сын. Але з шасці дзяцей засталося толькі трое — Лілія, Ганна і Тамара. Усе тры сястры цяпер жывуць у Навасёлках, куды ўжо даўно пераехалі з Макаршчыны. У Лілії Радзівонаўны — пяцёра дзетак, а ў Ганны і Тамары — па трое. Самая багатая на ўнукаў — Лілія, іх у яе ўжо дзевяць, і гэта, як лічыць жанчына, яшчэ не мяжа... Троху засмучае Лілію Радзівонаўну толькі тое, што яе ўнукі, ды і сястрынскія таксама, не імкнуцца працягнуць традыцыі іх роду. У іх на мэце — скончыць школу і паехаць жыць у горад.

ПЕРЫПЕТЫІ ЛЁСУ

Лілії Радзівонаўне цяпер 65 гадоў. 16 з іх яна ўжо на пенсіі. Пайшла на заслужаны адпачынак у 49, як шматдзетная маці. У 39 у яе не стала мужа, загінуў. Давялося самой паднімаць на ногі пяцёра дзяцей. Вучыла. Кожнаму зрабіла вяселле, купіла швейную машынку і ўсё неабходнае, каб можна было пачынаць самастойна гаспадарыць.

Якім было яе ўласнае жыццё?

— Дзе смеючыся, а дзе змахваючы нечаканую слязіну, яна апавядае аб праляцеўшых у цяжкай працы гадах, аб блізкіх ёй людзях, аб тым, як давялося навучыцца літаральна ўсяму, у тым ліку і мужчынскай рабоце — пілаваць, габляваць, цэментаваць. Магла б, напэўна, і з камбайнам упраўляцца, навучылася ж вадзіць матацыкл ужо пад сорак...

Бацька Лілії быў строгага нораву. З Евангеллем ён не расставаўся.

— У час вайны фашысты спалілі нашу толькі што адбудаваную хату, — расказвае Лілія Радзівонаўна, — за тое, пэўна, што бацька ваяваў на фронце. Ён, дарэчы, дайшоў да Берліна, медалі меў.

У 1952 годзе сям'і Радзівона Лапачонка нечакана пашанцавала — яны выйгралі па аблігацыі дзяржпазыкі пяць тысяч рублёў. Грошы на той час былі вельмі вялікія. Тысячу Радзівон патраціў на тое, каб выратаваць сына, які сур'ёзна захварэў пасля атрыманай траўмы. Але той так і не падняўся. За тры тысячы Лапачонкі набылі сабе дом. Потым вырашылі паспрабаваць шчасця на цаліне. У 1957 годзе з'ехалі на цаліну, а праз два гады вярнуліся. Прывезлі троху грошай. Лілія тады на свае "кроўныя" купіла гатовыя вокны ў дом. Бацькі набылі шафу і яшчэ тое-сёе з хатняй абстаноўкі. А праз пару гадоў дзяўчына пайшла замуж. У 22 гады ў яе было ўжо чацвёра дзяцей, двое з іх — "блізняты". Маладая жанчына працавала на ферме даяркай.

У рэдкія моманты, калі было перароблена ўсё, яна бралася за вышыўку. І на беласнежным палатне з'яўляліся нябачаныя ў тутэйшых краях папугаі, звяры і кветкі, створаныя багатай фантазіяй таленавітай ад прыроды жанчыны. Паглядзець на вышыванкі, карункі і на вывязаныя абрусы прыходзілі суседзі і дзівіліся іх прыгажосці.

— У нас у сям'і ўсе рукастыя, як і бацька, — расказвае сястра Лілії Радзівонаўны Ганна, — умеюць шыць, вязаць, упрыгожваць хату, але Лілька — лепей за ўсіх. Яшчэ дзяўчынкай, памятаю, неяк узяла яна старую шпалерыну і размалявала яе каляровымі алоўкамі, быццам гэта дыван, і павесіла над ложкам. Бывала, усюды кветак насадзіць, нейкую прыгажосць усё выробляе...

Лілія Зарэцкая пакорліва несла свой крыж. Калі не стала мужа, яна ўзваліла на свае плечы весь цяжар гаспадарчых клопатаў і адказнасці за свой род. Дагледзела старых бацькоў. Летам і ўвосень звычайна ўсаджвала ў каляску матацыкла ўвесь свой "вывадак" і адпраўлялася з імі ў лес, каб нарыхтаваць на зіму ягад і грыбоў, насушыць розных траў, нарабіць настояў.

МАСТАЧКА ПА ЖЫЦЦІ

...Лілія Радзівонаўна не скардзіцца на свой лёс. Яна ніколі не пашкадавала, што нарадзіла пецярых дзяцей. Душа ў яе баліць цяпер толькі за тое, каб у яе "родненькіх" жыццё склалася добра. Вялікая сям'я, як аказалася, — гэта вельмі добра. Цяпер усе "нашчадкі" круцяцца вакол планеты з імем Лілія, якая, па іх глыбокім перакананні, упрыгожвае сабой жыццё, пасылае свету любоў і ласку.

Па 15 гадзін у дзень Лілія Радзівонаўна праводзіць за вышываннем. Яна быццам стараецца навярстаць упушчанае, тое, што не паспела зрабіць у маладыя гады.

— Я з ахвотай і радасцю раблю сваю справу, — кажа Лілія Радзівонаўна на развітанне. — Адно вось шкада, што не выйшла мне павучыцца. Сем класаў толькі і ўзяла. А інакш — то пэўне ж, стала б мастачкай.

Лілія Зарэцкая дарэмна так кажа, бо яна і ёсць самая сапраўдная мастачка, па жыцці мастачка...

Марыся ГЖЭШЧАК.

Майстэрня

Лозапляценне

УРОК ПЯТЫ: ПЛЯЦЕННЕ ВЯРОВАЧКАЙ



Пляценне вяровачкай выкарыстоўваецца для пляцення донцаў, замацоўвання сценак вырабаў, а таксама больш слабых палос іншага віду пляцення. Гэты спосаб надае рэчам асаблівую трываласць і прыгажосць.

Рыхтуюць доўгія і гнуткія пруты рознай даўжыні, тоўстыя іх канцы зразаюць пад невялікім вуглом. Робяць вяровачку ў два, тры, чатыры, пяць і болей прутоў. Гэты від пляцення ўжываецца даволі шырока: для фіксацыі стаякоў на роўных адзін ад аднаго адлегласцях, адбіўкі аднаго віду пляцення ад другога, замацоўвання менш трывалых палос іншых відаў пляцення або з дэкаратыўнай мэтай, каб падкрэсліць палосы рознага пляцення. У гэтым выпадку карыстаюцца вяровачкай у два пруты. Для мацавання вырабу яго краі аплятаюць вяровачкай у тры і болей прутоў. Тады адзін спосаб пляцення выдзяляецца ад другога і надае рэчам больш дэкаратыўнасці і вытанчанасці. Пры пляценні вяровачкай у два пруты бяруць доўгі і кароткі пруты. Плятуць злева направа. Адзін з іх камлём закладваюць за першую стойку, аплятаюць другую звонку, трэцюю знутры і выводзяць вонкі паміж трэцяй і чацвёртай. Другі прут закладваюць пад першы паміж другой і трэцяй стойкамі, агінаюць трэцяю звонку, чацвёртую знутры і выводзяць канец яго паміж чацвёртай і пятай стойкамі. Першы прут павінен быць знізу, а другі зверху. Пляценне працягваецца ў правы бок аналагічна. Пры гэтым абодва пруты як бы скручваюцца між сабой па гадзіннікавай стрэлцы. Такая вяровачка называецца "прамой". Калі пруты скручваюцца супраць гадзіннікавай стрэлкі, альбо пляценне вядзецца справа налева, атрымоўваецца "зваротная вяровачка". Пры шчыльным спалучэнні прамой і зваротнай вяровачак робіцца від пляцення "елачка". Яго выконваюць звычайна на донцы авальных карзін, корабаў, а таксама пры пляценні кантаў. Існуе яшчэ "падвойная вяровачка", пляцецца як і адзінарная, толькі паміж стойкамі закладваюць падвойны прут. Для таго, каб вяровачка была роўнай, пруты складваюць камлём з вяршыняй. Вяровачку ў тры пруты плятуць адначасова трыма прутамі пры пераходзе ад днішча вырабу да вертыкальных бакоў. Для мацавання сценак ужываецца вяровачка з чатырох альбо пяці адлькавых прутоў, краі прадмета аплятаюць вяровачкай, і яна надае прыгожы выгляд.



Ніна БУРАКОЎСКАЯ,
вядучы метадыст Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці.
Ірына ШТЭФАН,
старшыня абласнога клуба майстроў народнай творчасці "Умельцы Міншчыны".



Пакарэнне вулканаў Эквадора

Працягваюцца прыгоды беларускай каманды праекта "Сем вяршынь". Пра апошняе ўзыходжанне на самыя высокія вулканы свету напярэдадні 60-годдзя Вялікай Перамогі мы нядаўна далі кароткае паведамленне. Сёння пачынаем цікавы аповед кіраўніка групы альпіністаў Сяргея ВАРЫВОДЫ.

— Сяргей, давайце пачнём з вынікаў вашай апошняй экспедыцыі...

— Напярэдадні Дня Перамогі наша група з 13 чалавек знаходзілася ў Паўднёвай Амерыцы, у Эквадоры. А калі дакладна, то 7 мая каля 6 гадзін раніцы па мясцовым часе чатыры чалавекі — Сяргей Варывода, Валерый Дымент, Ірына Мішчэнка і Алена Якубоўская падняліся на вяршыню раней не пакоранага беларускімі экстрэмаламі вулкана Катапаксі. Менавіта там намі быў устаноўлены Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь і разгорнуты сцяг галоўнага інфармацыйнага спонсара экспедыцыі — Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БелТА).

— Якія вяршыні вы яшчэ пакарылі ў рамках праекта "Сем вяршынь"? І якія планы на гэты год?

— Пачалося ўсё з узыходжання на Эльбрус (5642 м), далей былі Кіліманджара (5895 м) і Аконкагуа (6962 м) — адпаведна вышэйшыя кропкі Еўропы, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі. Мы імкнёмся прыцягнуць грамадзян да актыўнага ладу жыцця, горна-пешага турызму і альпінізму. Наша задача — паказаць, што на самай справе ёсць альтэрнатыва і пляжнаму адпачынку і "піўному ўік-энду". А спартыўнай мэтай праекта з'яўляецца ўзыходжанне на самыя высокія вяршыні кантынентаў. Мы гаворым кожнаму новаму ўдзельніку: ты можаш, табе ўсё па сілах і ў тваім жыцці будзе свой Эверэст. Гэта захапляе, мабілізуе сілы, усяляе ўпэўненасць. Да 60-годдзя Перамогі рыхтавалася экспедыцыя на вышэйшую кропку Акіяніі — Піраміду Карстэнз (4884 м). На жаль, мы не змаглі атрымаць дазвол ад улад Інданезіі на вандроўку ў гэтым раёне. Праблема была звязана з небяспечным становішчам на востраве Папуа Новая Гвінея пасля цунамі ў снежні. Рэальнай альтэрнатывай у апошні момант быў выбраны Эквадор з яго самымі высокімі ў свеце вулканамі: Катапаксі (5897 м), які зараз з'яўляецца дзейным, і Чымбараза (6310 м), што патух.

— Хто з беларусаў адважыўся правесці адпачынак на вулкане? Чым яны займаюцца ў паўсядзённым жыцці?

— У Эквадор паехалі 13 чалавек, нягледзячы на нятанны кошт узыходжання, людзей сабралося больш, чым у папярэднія экспедыцыі. Сярод членаў каманды ўрачы, бухгалтар, біёлаг, дзяржаўны служачы, прадпрымальнікі. У паўсядзённым жыцці мы ўсе звязаны з маларухомай працай, таму горны трэнінг хаця б раз у год — добрае ўзрушэнне для арганізма. Мяне часта пытаюцца: "Вы аматар ці прафесіянал?" Я заўсёды адказваю так: "Прафесія — гэта асноўны род заняткаў. У нашай краіне няма альпіністаў, якія зарабляюць сабе на хлеб узыходжаннем у горы. Ёсць альпіністы, якія ходзяць у горы даўно, некаторыя не так даўно, ёсць больш моцныя і больш слабыя як фізічна, так і тэхнічна. Спадзяюся, калі-небудзь будуць арганізаваны спаборніцтвы і ў беларускім альпінізме, тады многае стане на сваё месца".

— Можа вы неспадзявана сустрэлі ў Эквадоры нашых суайчыннікаў? Ці ведаюць там пра Беларусь?

— Не, з суайчыннікамі сустрэч не было, толькі з украінцамі, але і гэта вельмі прыемна. Ці будуць памятаць нас у Эквадоры? Спадзяюся, што так. Аб тым, хто такія беларусы, цяпер нашы гіды могуць расказаць іншым. Такое не забываецца. Акрамя таго, на памяць нашым эквадорскім сябрам мы пакінулі фірменныя майкі з беларускім сцягам, сувеніры.

Падкрэслю, што Эквадор — краіна вулканаў. Іх тут больш за сотню, прычым каля дзесятка дзейных. Па плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва краіна вельмі падобная на Беларусь. Каля паловы 12-мільённага народа — іспанамоўнае насельніцтва, астатнія — карэнныя жыхары-індзейцы, выхадцы з Афрыкі.

Эканоміка Эквадора ў многім трымаецца на нафтаздабычы. Хаця механізацыя земляробства вельмі нізкая, тут ёсць дзе знайсці прымяненне нашым трактарам! Толькі вось прыстасаваць бы іх да гарыстай мясцовасці. А то індзейцы ўручную апрацоўваюць палі на схілах гор такой круцізны, што і ўстаяць месцамі не проста. Але эквадорцы, як і беларусы, народ спакойны і цярплівы.

— І ўсё ж, відаць, у іх надзвычай небяспечныя ўмовы жыцця?

— Жыхары Эквадора жывуць у прамым і ў пераносным сэнсе на вулкане. Напрыклад, Гуа Гуа летам 2000 года заваліў горад слоем попелу ў 2-3 сантыметры. Два тыдні аўтамабілі не выязджалі на вуліцы, самалёты не ляталі, а жыхары прыбіралі вулканічны попел. Вялікай трагедыяй пагражае прагназуемае Ваенным геафізічным інстытутам вывяржэнне Катапаксі, якое можа забраць да ста тысяч жыццяў. Нам неаднаразова давялося бачыць сляды актыўнай вулканічнай дзейнасці. Масавая эвакуацыя жыхароў з раёнаў вулканічнай актыўнасці — звычайная з'ява для эквадорцаў. Але людзі да ўсяго прызвычайваюцца — даводзілася бачыць пасяленне нават у кратэры вулкана! У нас задача была больш прастая — карыстаючыся момантам, прабрацца бліжэй да сэрца вулкана. З пункту гледжання альпінізма вулкан — тая ж гара. Толькі на вяршыні замест піка ці плато — кратэр. Гэта само па сабе больш відовішчна. Вулкан тоіць у сабе легенду, моц, якая ў любы момант можа абудзіцца. Увогуле, узыходжанне на дзейны вулкан — гэта прыгодніцкі альпінізм. Дарэчы, у многім ідзя адправіцца на дзейны вулкан была навеяна вялікай панарамай кратэра Кіліманджара, які мы назіралі падчас экспедыцыі ў Афрыку ў 2003 годзе.

— Якія цяжкасці ўзнікаюць пры ўзыходжанні? Наколькі падрыхтаваным фізічна і псіхалагічна павінен быць чалавек?

— Першапачатковая праграма ўзыходжання была звышзадачай. Мы меркавалі зрабіць чатыры ўзыходжанні за сем дзён, што маларэальна нават для вельмі падрыхтаванага альпініста. Тэмп узыходжанняў, на жаль, аказаўся не па сіле некаторым удзельнікам экспедыцыі. Акліматызацыя чалавека да вышыні мае свае правілы. Горная хвароба ў альпінізме не менш грозная, чым кесонная ў падводнікаў. Яна ўносіць жыцці, пачынаючы з трох тысяч метраў. А на шасцітысячніку Мак-Кінлі ў Паўночнай Амерыцы, напрыклад, ад яе загінуў кожны сёмы падарожнік. Заўважу, што набор вышыні ў дзень не павінен перавышаць 400-500 метраў. Перыядычна неабходны дні адпачынку і акліматызацыі. Да таго ж, пояс гіпаксіі ў Андах кіламетра на паўтара ніжэй, чым у Гімалаях, ён блізкі да Каўказа. Беларускім экстрэмалам ужо на другі дзень давялося падняцца на 1000 метраў і правесці начоўку на вышыні 3800 метраў над узроўнем мора на краі кратэра вулкана Кілатоа. Гэта вяршыня і стала выніковай для навічкоў — чацвёра з прыступамі горнай хваробы спусціліся ўніз.

Адзначу, што кратэр Кілатоа ўтварае чашу прыгажэйшага вулканічнага возера з смарагдавай водой. Вучоныя не спяшаюцца спісваць Кілатоа ў запас. Пад вадой ідзе інтэнсіўнае газавыдзяленне. Нічога жывога ў возеры няма.

Мы правялі ноч у хіжыне індзейцаў Кечуа і раніцай спусціліся ў кратэр да возера. Я апусціў свой паходны наручны гадзіннік у ваду — 14,8 градусаў па Цэльсію. Вырашылі пакупацца. Ногі хутка праваліліся скрозь слой вулканічнага попелу. Адразу адчуўся пах серы. На лодачцы мясцовага індзейца пераплылі возера — метраў васемсот у дыяметры. Падняліся зноў на грэбень вулкана, абагнулі кратэр па краю і — уніз. Трэба спяшацца далей...

Заканчэнне будзе.

Падрыхтавала Юльяна СІНКЕВІЧ.

Канада

Сляды Багдановічаў знайшліся

Бываюць жа цуды! Не паспеў "Голас Радзімы" (№22-23 ад 9.06.2005) надрукаваць мой ліст пра тое, што хацела б на Маладзечаншчыне ці Вілейшчыне знайсці сваіх родных, як у Паўночную Амерыку паспяшаліся ад сваякоў першыя электронныя пасланні, што нядзіўна ў наш глабалізаваны час.

Адгукнуліся асобы, якія ведаюць маю сям'ю — напэўна, дзякуючы абвестцы ў газеце. Вельмі ўдзячна вам, з гэтага часу будзем дзейнічаць далей. Адгукнуліся Апетыонак (Апяцёнак? — Рэд.) Аляксандр з Маладзечна, Яніна Шкода — майго бацькі першая ўнучка. Некалькі асоб напісалі па-руску, і лісты знаходзяцца ў перакладчыка. Да ўнучкі ўжо адпісала тры разы, але яна мне не адказвае, таму, думаю, што маё электроннае пісьмо не дайшло. Пан Аляксандр нарадзіўся ў вёсцы Трыгузі (Вязынскага сельсавета Вілейскага раёна. — *Рэд.*). Ён знайшоў таксама Яніну (дачку Багдановіча. — *Рэд.*) і яе ўнучку.

Паведамілі мне, што жывуць браты майго бацькі, Васіль і Уладзімір, у Трыгузях. Мясцовасць, дзе нарадзіўся мой бацька, называецца Наўдзехі (вёска сёння не існуе; гэта тэрыторыя Чысценскага сельсавета Маладзечанскага раёна. — *Рэд.*). Цешуся, што маю гэтую інфармацыю.

Сардэчныя прывітанні

Аляксандра БАГДАНОВІЧ-ШЧУКОЎСКАЯ.

Ізраіль

Адкрыты мемарыял у Ашдодзе

22 чэрвеня ў горадзе Ашдодзе адкрыты мемарыяльны комплекс, прысвечаны памяці яўрэяў, якія загінулі ў гады Другой сусветнай вайны. Помнік, на якім высечаны імёны 325 загінуўшых у гады вайны родных і блізкіх ізраільцян — выхадцаў з краін СНД, устаноўлены па ініцыятыве Федэрацыі рускамоўных ізраільцян, зямляцтва ўкраінскага горада Алеўск і ашдодскага адзялення Усеізраільскага аб'яднання выхадцаў з Беларусі пры падтрымцы мэрыі горада.

Асобны фрагмент помніка прысвечаны яўрэям, загінуўшым у гады вайны на тэрыторыі нашай рэспублікі. Выхадцы з Беларусі, якія пражываюць у Ізраілі, размясцілі ў падножжы манумента зямлю з мінскага гета, Брэсцкай крэпасці і існаваўшых на тэрыторыі рэспублікі канцлагераў.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел мэр і члены гарадскога савета Ашдода, ізраільскія ветэраны Другой сусветнай вайны, прадстаўнікі зямляцтваў краін СНД і пасольстваў Беларусі, Казахстана, Расіі і Украіны.

У сваім выступленні прадстаўнік Пасольства Беларусі ў Ізраілі падкрэсліў, што гістарычная памяць аб выпрабаваннях, што выпалі на лёс беларускага і яўрэйскага народаў, умацоўвае развіццё беларуска-ізраільскіх адносін у наш час. Асобна быў падкрэслены той факт, што 22 чэрвеня ў Беларусі з'яўляецца Днём усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, што беларускі народ аддае даніну павагі ўсім загінуўшым, не звяртаючы ўвагі на нацыянальную ці рэлігійную прыналежнасць.

У таварыстве "Радзіма"

КНІГА — СЯБРУ

Завяршыўся трэці этап па збору кніг для суайчыннікаў замежжа, які праходзіў пад дэвізам "Кніга — сябру". Калі ў першых двух этапах прымала ўдзел моладзь сталіцы, то ў гэты раз межы пашырыліся, і ў рух уключылася Міншчына: Валожын, Заслаўе, Мядзель, Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Івянец, Жодзіна, Стоўбцы, Старыя Дарогі, Пухавічы. На працягу месяца актывісты БРСМ збіралі беларускія кнігі і выданні аб "зямлі пад белымі крыламі". Сабрана больш за тысячу кніг на беларускай мове — ад дзіцячых казак да твораў беларускіх класікаў.

Моладзь праявіла вялікую цікавасць да інфармацыі аб беларускай дыяспары, пыталася аб беларускіх суполках, аб тым, як яны дзейнічаюць, прасіла адрасы для перапіскі. Усе шчыра спадзяюцца, што сабраныя кнігі стануць прыемным падарункам для землякоў замежжа. Зараз кнігі знаходзяцца ў таварыстве "Радзіма" і чакаюць спаткання з вамі, дарагія землякі, дасылайце свае заяўкі.

АРХІВЫ "РАДЗІМЫ" КАРЫСНЫЯ НАВУКОЎЦАМ

Архіўныя фонды, якія збіраліся таварыствам "Радзіма" на працягу многіх гадоў, не ляжаць мёртвым грузам, яны адкрыты для асоб, зацікаўленых у набыцці звестак аб тых ці іншых падзеях з жыцця беларускай дыяспары.

Выкладчык кафедры філасофіі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта Сяргей Шабельцаў знайшоў шмат карыснага для напісання сваёй навуковай працы. Нядаўна ён паспяхова абараніў дысертацыю па тэме "Украінцы і беларусы ў Аргенціне: грамадска-палітычная дзейнасць і сувязі з Радзімай". Мы віншуем яго і прымаем падзяку ў адрас "Радзімы", якая, па словах дысертанта, "беражліва захоўвае архіўныя дакументы, што ўяўляюць вялікую цікавасць для гісторыкаў, якія спецыялізуюцца на вывучэнні беларускай дыяспары."

ВУЧНІ ШКОЛЫ ІМЯ ЯНІСА РАЙНІСА НАВЕДАЛІ МІНСК

У чэрвені настаўнікі сярэдняй школы № 6 імя Яніса Райніса з горада Даўгаўпілса (Латвія), сярод якіх былі прадстаўнікі беларускага асяродка, наведалі сталіцу Беларусі горад Мінск. Гэта паездка адбылася дзякуючы падтрымцы Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь і асабіста генеральнага консула Г. Ахрамовіча, а таксама намаганням беларускага таварыства "Уздым" і асабіста настаўніцы беларускай мовы Т. Бучэль. Таварыства "Радзіма", якое ўзяло на сябе арганізацыю праграмы знаходжання ў Мінску настаўнікаў з Даўгаўпілса, паклапацілася, каб госці змаглі лепш пазнаёміцца са сталіцай Беларусі, адчулі добразычлівасць, гасцінасць і сардэчнасць беларускага народа, завязалі новыя творчыя знаёмствы, новае сяброўства. Паездка ў Мінск была не толькі культурна-пазнавальнай, але мела таксама і дзелавы характар. Для педагогаў з Даўгаўпілса былі арганізаваны наведванні дзвюх мінскіх сярэдніх школ: 207-й у Маскоўскім раёне і 196-й у Першамайскім, дзе яны сустрэліся з педагагічнымі калектывамі, паўдзельнічалі ў "круглым стале", абмяняліся поглядамі на навучальна-выхаваўчыя працэсы. Экскурсіі па гораду, наведванне тэатра і выдатных мясцін дадалі прыемных і незабыўных уражанняў ад спаткання з Беларуссю.

БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЦІ АДПАЧЫВАЮЦЬ У МАЛДОВЕ

Таварыства "Радзіма" сумесна з дабрачыннай арганізацыяй "Этнічны голас Амерыкі", якую ўзначальвае наша зямлячка Ірэна Каляда-Смірноў, у ліпені бягучага года арганізуе дабрачынныя выступленні дзіцячага ансамбля "Цернічка" ў беларускіх суполках Малдовы. Маладыя артысты будуць знаходзіцца на адпачынку ў аздараўленчым лагеры непадалёку ад Кішынёва. У вольны час яны выказалі жаданне парадаваць беларусаў у Малдове сваім мастацтвам.

Галіна НАВІЦКАЯ, каардынатар праектаў таварыства "Радзіма".

Падзяка

Удзячная за вельмі добрае віншаванне з 75-годдзем.

Жадаю ўсім супрацоўнікам творчага поспеху на карысць нашай мілай Радзімы.

З павагай А.САЗАНКОВА.

***

Сонца грэе здаля, —
Не звяртаем увагі.
Калі сонца няма —
Няма зорнае цягі.

Няўтульна тады,
А чаму — невядома.
Тыя ж кветкі, сады,
А ў душы адно — стома.
Хай за хмаркай прамень
І турбот незлічона.
Будзе сонечны дзень —
І жыцця лад шалёны.

Заўжды ведалі каб —
Прамень побач, за хмарай.
Чалавек надта слабы,
Без надзеі і мары.

28.07.2005г. Латвія, Даўгаўпілс.

Беларусы ў Паўночным Казахстане

Беларусаў у Паўночным Казахстане больш за 11 тысяч чалавек. Многія тут нарадзіліся: іх дзяды, бацькі ў свой час прыехалі на асваенне цаліны, па размеркаванні пасля вучобы ці проста ў пошуках новага месца працы.

Сярод вядомых людзей, якія прыехалі ў Казахстан з Беларусі — ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Фролавіч ПАНУРОЎСКІ. Ён пражыў вельмі цікавае жыццё. Прымаў удзел у ветэранскім руху Савецкага Саюза. Яму давялося сустракацца з вядомымі людзьмі. Аляксандр Фролавіч уваходзіў у склад Усесаюзнага Савета ветэранаў. Ён з'яўляецца адным з ініцыятараў напісання кнігі Памяці, быў у ліку тых, каго прымаў М.Гарбачоў з нагоды яе выдання.

Мікалай Міхайлавіч ГУСАКОЎ — ветэран асваення цалінных і залежных зямель, многа зрабіў для развіцця сельскай гаспадаркі Петрапаўлаўскай вобласці.

Міхаіл Ульянавіч РАМАНОЎСКІ — дырэктар адной са школ Петрапаўлаўска. Педагог са шматгадовым стажам, выкладчык гісторыі, ён узначальвае сярэднюю школу № 9 з моманту яе заснавання.

Сяргей Дзмітрыевіч ЧАПУРА кіруе вядомай за межамі вобласці кампаніяй — кансорцыумам "Малсервіс АТФ". Таленту кіраўніка, якім валодае гэты чалавек, можна пазайздросціць.

Беларусы жывуць ва ўсіх раёнах вобласці. У Петрапаўлаўску знаходзіцца толькі малая частка абшчыны. Беларускі культурны цэнтр "Радзіма" створаны адносна нядаўна, афіцыйна зарэгістраваны 10 верасня 2003 года. За такі кароткі тэрмін існавання яму давялося многае зрабіць. Як расказвае кіраўнік цэнтра Раіса Солапава, тут ладзяцца канцэрты беларускай музыкі, паэтычныя вечары, на якіх свае вершы чытаюць і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Усе гэта садзейнічае адраджэнню беларускай мовы, звычак і традыцый.

Кіраўніцтва вобласці падтрымлівае дзейнасць нацыянальных культурных аб'яднанняў, у тым ліку і беларускага культурнага цэнтра "Радзіма". Акім (мэр) вобласці аказаў матэрыяльную дапамогу, якая пайшла на патрэбы цэнтра — набыццё нацыянальных сцэнічных касцюмаў і музычных інструментаў для мастацкай самадзейнасці.

Беларуская абшчына мае добрыя ўмовы для распаўсюджвання культуры свайго народа, што адпавядае дзяржаўнай палітыцы Казахстана па ўмацаванні міжнацыянальнай згоды.

Пастаянную сувязь з культурным асяродкам "Радзіма" падтрымлівае Пасольства Беларусі ў Казахстане. Пасол Ларыса Пакуш у час сваіх паездак у Петрапаўлаўск заўсёды цікавіцца жыццём беларускай абшчыны. Пры яе ўдзеле і садзейнічанні з гістарычнай радзімы паступае літаратура на роднай мове, дапаможнікі. Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма" таксама ўдзельнічае ў захаванні і падтрымцы беларускай культуры, мовы на далёкай казахскай зямлі. Раіса Солапава пасля стажыроўкі кіраўнікоў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, якую праводзіла таварыства "Радзіма", таксама павезла дадому, акрамя ўражанняў ад сустрэчы са сваёй Бацькаўшчынай, стос беларускіх кніг. Спадзяёмся, гэта літаратура з'явілася добрай дапамогай беларускаму аддзяленню петрапаўлаўскай школы нацыянальнага адраджэння. Тут працуе Любоў Адзінаркава. Яна скончыла беларускую школу ў Полацкім раёне. Жыццё склалася так, што яна апынулася ў Казахстане. Паступова, з гадамі, родная мова пачала забывацца. І зараз Любоў Міхайлаўна разам са сваімі вучнямі асвойвае яе зноў і вельмі задаволена поспехамі. А калі ў час знаходжання ў Мінску на канцэрце фальклорных гуртоў акунулася ў беларускі асяродак, было такое адчуванне, што ніколі не ад'язджала з Беларусі, так лёгка ўспрымалася родная беларуская мова. Добрай і ўважлівай ведаюць Любоў Міхайлаўну вучні нацыянальнага класа, у якім вывучаюць родную мову, літаратуру, краіназнаўства, знаёмяцца з народнымі традыцыямі. Вывучаючы мову, важна больш чытаць. На ўроках вучні знаёмяцца з творчасцю Якуба Коласа, Янкі Купалы, Янкі Брыля, Пятруся Броўкі. Любоў Міхайлаўна ўпэўнена, што вельмі важна ведаць родную мову, культуру свайго народа, бо тады асоба можа раскрыцца больш поўна, усебакова.

Галіна НАВІЦКАЯ.

Ад нас адышлі

Аляксандра БЕРГМАН

У Польшчы 20 чэрвеня 2005 года памерла А. Бергман, старэйшы беларускі і польскі гісторык, публіцыстка, журналістка, грамадскі дзеяч Польшчы і Беларусі ў 20-30-х гадах XX стагоддзя.

А. Бергман нарадзілася 1 мая 1906 года ў Гродне. Пражыла доўгае і насычанае падзеямі жыццё.

Была ўдзельніцай Першага з'езда КПЗБ (1928).

Пасля пераезду ў Польшчу прымала актыўны ўдзел у жыцці беларускай дыяспары. ("ГР" пісала пра А. Бергман. Гл. № 22-25, 2004 г.)

Чытайце "Голас Радзімы" ў Інтэрнэце Belarus21.by/gazet

З парыжскіх знаходак

Лісты Яна Чачота да Марыі Путкамер (Верашчакі)



У трэцім сваім аповедзе хачу расказаць яшчэ пра адну знаходку ў аддзеле рукапісаў Музея Адама Міцкевіча ў Парыжы. Гэта дзесяць лістоў беларускага і польскага паэта і фалькларыста Яна Чачота (адз. зах. 1003). Адрасаваны яны графіні Марыі Путкамер (у дзявоцтве — Верашчака) і маюць цікавасць як для даследчыкаў гісторыі польскай, так і беларускай культур.

Найперш — колькі слоў пра саму адрасатку. Ураджэнка маёнтка Туганавічы на Навагрудчыне, яна была першым каханнем Міцкевіча. Але ён, прадчуваючы будучыя жыццёвыя выпрабаванні, па сутнасці адмовіўся ад шчасця, саступіўшы месца графу Ваўжынцу (Лаўрыну) Путкамеру, які жыў у Бальценіках (цяпер Воранаўскі раён). Насуперак міфам гэта быў не "крывасмок", а чалавек з перадавымі поглядамі, вельмі лагодны і спагадлівы як у дачыненні да прыгонных сялян і да жонкі, так і да самога Міцкевіча — нават дазваляў паэту прыязджаць на святы ў свой маёнтак...

І вось у Бальценікі Чачот, блізкі сябар Міцкевіча, пасылае лісты. Першы з іх (вы яго бачыце на фотакопіі, ласкава спрэзентаванай мне ў музеі) датаваны 28 сакавіка 1823 года. Найперш кідаецца ў вочы адсутнасць звароту. Бо як Чачоту было звяртацца да жанчыны, якая толькі што па-сяброўску прымала іх, віленскіх студэнтаў-філаматаў, у Туганавічах? Графіня? Не паварочвалася пяро. Ты? Пан Ваўжынец палічыў бы гэта фамільярнасцю... Адсюль звароты апісальныя, у трэцяй асобе.

Куды больш істотна тое, што Чачот просіць Путкамер напісаць музыку на яго вершы. Пасылае іх на выбар ажно тры: "Радзівілаўна", "Рэпіха", "Альдона" (іншыя "ўжо раздадзены"). *"Тэрмінаў ніякіх не прызначаю, а фартэпіяна (...) акажацца калісьці пад рукой: нарэшце калі-небудзь з'явілася б надзея, што Пані дапасуе музыку. Якая гэта будзе для нас раскоша, калі Зося (Малеўская, каханая Чачота. — А.М.) будзе спяваць твор на Пані музыку; цяжка гэта выказаць!"*.

Наступныя пяць лістоў таксама адпраўлены з Вільні ў Бальценікі ў тым жа 1823 годзе. У іх Чачот дзеліцца сваім жаданнем наведаць маёнтак Путкамераў, пашпацыраваць з яго гаспадыняй "па лясах, гаях і лугах". Адрасант дапамагаў задавальняць высокія інтэлектуальныя запатрабаванні адрасаткі: пасылаў ёй творы папулярнага тады сярод прыхільнікаў рамантызму Вальтэра Скота, звяртаў яе ўвагу на французскае выданне "Даратэі і Германа" Гётэ, раманы Рэдкліф. Усё гэта сведчыць, што еўрапейскія літаратурныя павевы і навінкі імгненна распаўсюджваліся і на беларускіх землях.

І вядома ж, у лістах яўна або завуалявана прысутнічае Ён, Міцкевіч. 19 мая 1823 года Чачот таямніча паведамляў Путкамер, што вярнуўся ў Вільню Антон Адынец, паэт з Ашмяншчыны. *"Прывёз ён (з Коўна? — А. М.) навіны ад нашага сябра Паэта — здаровы, ездзіць на шпацыры"*. І тут жа раіў графіні, каб яна кінула курыць люльку, выбрала "нешта іншае".

Разам з сябрамі-філаматамі ў 1824 годзе Чачот быў сасланы ў "аддаленыя губерні" Расійскай імперыі (Кізіл, Уфа). Першы ліст адтуль у Бальценікі быў адпраўлены толькі 8 кастрычніка 1830 года. У ім найперш паведамляецца радасная вестка: ссыльнаму паэту нарэшце дазволілі *"выбраць месца прабывання паводле свайго жадання. Мяркую пасля Новага года накіравацца ў Пецярбург і загляну па дарозе да Тамаша (Зана ў Арэнбург. — А. М.)". Паэту хацелася б "пабачыць Марыю са свойскай жывёлай і дзецьмі, якія вучацца быць карыснымі краіне"*. Яму не падабаецца, што Путкамер называе яго не каханым панам Янам, як раней, а толькі шаноўным: *"Вельмі таго не хачу, прашу (ранейшае) званне вярнуць"*.

І зноў у лісце з'яўляецца Ён, Міцкевіч: *"Тое, што Марыя расказвае пра шлюб нейкага Ягамосця з нейкай паненкай (Цэлінай Шыманоўскай. — А. М.), дык першы раз пра гэта чую і па некаторых прычынах (...) лічу гэта легендай"*. Але добра, калі б так было на самай справе, бо прынесла б генію *"патрэбнае супакаенне"*.

Урэшце зноў закранаецца кампазітарская тэма: "Таксама не люблю таго, што Марыя адмаўляецца пісаць музыку на вершы і пакідае гэтую справу вялікім талентам. (Патрабую), каб гэта была б музыка толькі Марыі, і не ў маім характары, каб адступіць ад свайго намеру, хіба што мае тэксты застануцца без музыкі".

Апошнія два лісты адпраўлены Чачотам з Лепеля, куды яму дазволілі перасяліцца пасля ссылкі. Паэт працаваў там сакратаром дырэкцыі Бярэзінскага канала. Цяпер ён адчуваў сябе *"ўбогім жабраком"*, аслабленым фізічна і духоўна ("запозна мне дзяўчаты на фартэп'яна іграюць"). Аднак паўночная Беларусь яму спадабалася: *"Лепель мой знаходзіцца над велізарным возерам, рака плыве каля дома. Паблізу пясчаныя ўзгоркі. Гай далёка. Адзін ці два разы ў год даводзіцца туды хадзіць наўмысна. Скаўронкі ўжо (14 сакавіка. — А.М.) спяваць пачалі, дні прыгожыя, сапраўдны пачатак вясны, маёй дзяніцы"*. Урэшце тужліва: *"Колькі ж гэта разоў застаецца мне аглядаць вясну?"* Ад сябе дадамо: дзесяць разоў.

У тым жа лісце Чачот паведамляе, што ходзіць па навакольных вёсках — напэўна ж, каб запісваць свае "Вясковыя песенькі". Адначасова, відаць, ён ствараў новыя ўласныя вершы, пасылаў іх у Бальценікі, каб там напісалі на іх музыку. Пра гэта сведчаць радкі: *"Прыдумаў я варыяцыі (перапісаныя як "размаіткі"). Аўтарку ж (музыкі. -А. М.) назваў "Марыяй з Туганавіч". Пашле(це) "размаіткі" Тарэсе Казлоўскай на Падолле. Просіць яна прыслаць "больш нот уласнай кампазіцыі"! Абяцаны (мне) ноты на чатыры рукі, дык перадайце (іх) з Вільні праз Эразма Асалінскага"*.

З усяго гэтага вынікае, што ў асобе Марыі Верашчакі (Путкамер) Навагрудчына і Лідчына мелі таленавітага і адначасова вельмі сціплага кампазітара, вартага ўвайсці сёння ў энцыклапедычныя даведнікі.

Да сказанага трэба дадаць, што сярод рукапісаў Музея Адама Міцкевіча ў Парыжы пад нумарамі захавання 960 і 1019 таксама знаходзяцца лісты Яна Чачота да Галены Малеўскай (магчыма сястры Зосі) і Казіміра Пясецкага з Бортнікаў (яму паэт хоча прадаць сем тамоў твораў Тацыта, набытых ад нейкай прафесарскай удавы ў Лепелі).

З выяўленага ў аддзеле рукапісаў Польскай бібліятэкі ў Парыжы трэба назваць сем сшыткаў успамінаў Аляксандра Рыпінскага пра паўстанне 1830-1831 гадоў на Вілейшчыне, Дзісеншчыне і Свянцяншчыне, рукапісы эмігранта з Міншчыны Яўстафія Янушкевіча, фрагмент дзённіка Фларыяна Радзівіла са Слуцка і многае іншае.

Але каб праштудзіраваць усё гэта, трох дзён не хапіла. Праўда, удалося зафіксаваць сігнатуры (нумары захавання — прыдадуцца камусьці іншаму, наступнаму.

Адам МАЛЬДЗІС.

Кнігарня

Хроніка страт Беларусі

Амаль дзве трэці кнігі (88 старонак) "Страты Беларусі або Доля беларускага народа" Сымона Струменскага, настаўніка з Расіі, які авалодаў беларускай мовай, складае храналагічная "Хроніка пакутаў, стратаў і трагедый на Беларусі" — ад Полацкага і Тураўскага княстваў да смерці паэта Сыса. Страты гэтыя (гібель насельніцтва, разбурэнні гарадоў і вёсак) найперш наносіліся шматлікімі войнамі.

У "Хроніцы" таксама зафіксаваны матэрыяльныя страты — вывазы рухомых каштоўнасцей з беларускіх зямель. Гэта вываз скарбаў з Нясвіжскага замка ў час нашэсця напалеонаўскіх войск, каля 50 тысяч найлепшых экспанатаў з Віленскага музея старажытнасцей (прыгадаем, што ён узнік на аснове лагойскіх калекцый Тышкевічаў) пасля паўстання 1863 года, шасці вагонаў музейных, бібліятэчных і архіўных скарбаў з музея Эмерыка Гутэн-Чапскага ў Станькаве пад Мінскам (цяпер яны знаходзяцца ў Кракаве), знікненне з Магілёва Крыжа Ефрасінні Полацкай (але, хочацца дапоўніць і, не толькі яго, а і дзесяткаў тысяч іншых твораў выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і кніжнага мастацтва). Малавядомымі з'яўляюцца факты, што ў сакавіку 1919 года "з Гомельскага палаца Паскевічаў вывезена ў Маскву каля 100 пудоў золата і срэбра ў каштоўнасцях — вырабы прыкладнога мастацтва, фамільныя сервізы, унікальныя мастацкія творы" (с. 25).

Той жа тэматыцы, звязанай з выяўленнем і вяртаннем вывезеных каштоўнасцей, прысвечаны і раздзел "Беларускія скарбы — у суседзяў". Тут таксама багата невядомых і забытых фактаў. Напрыклад, той, што каменныя выявы "бабаў", якія раней упрыгожвалі Мінск, а ў час апошняй вайны знаходзіліся ў адным з берлінскіх паркаў, пасля вайны апынуліся ў Расіі, як і дзвінскі камень "Сумбораў Хрэст" (помнік эпіграфікі XII стагоддзя). У Германію і Аўстрыю трапілі, што чамусьці забываецца, асноўныя зборы Баранавіцкага музея.

Менш удаўся аўтару раздзел "Таленавітыя землякі за мяжой". Некаторых названых там асоб (Ігар Стравінскі, Інакенцій Смактуноўскі і іншыя) нельга залічыць да нашых землякоў — гэта толькі нашчадкі нашых суайчыннікаў.

Дарэчы ў кнізе аказаўся раздзел "Трагедыі, якія абмінулі Беларусь". Сапраўды Бог ратаваў нас у апошняе дзесяцігоддзе ад грамадзянскіх войнаў, тэрактаў ці хваляў цунамі. Заканчваецца раздзел радкамі: "Дзякуючы сацыяльнай палітыцы В. Кебіча і А. Лукашэнкі ў Беларусі не дапусцілі захопу (прыватызацыі) алігархамі буйных заводаў і фабрык, а таксама зямлі, як здарылася ў Расіі. Гэта стала фактарам стабільнасці, спакою і міру ў нашай краіне. Як кажуць у народзе, тут Бог жыве" (с. 112).

Нягледзячы на тое, што ў кнізе пералічана многа трагічных падзей, у цэлым яна выклікае ў чытача аптымістычны настрой: калі наш народ вынес такое, то жыць будзе.

Дзіяна ГРЫШАНАВА.

Мемуарыстыка эміграцкай літаратуры

Даследчыкам беларускай мемуарыстыкі пашанцавала: толькі што яны атрымалі для сябе настольны даведнік "Мэмуары на эміграцыі" Лявона Юрэвіча (Мінск, 2005). Яго аўтар жыве ў Нью-Йорку, вядомы чытачам па многіх публікацыях.

Асноўную частку кнігі складаюць бібліяграфіі беларускай замежнай мемуарыстыкі — асобна манаграфічных выданняў і асобна публікацый у перыядычным друку. Выдзелены некралогі, якія таксама ўтрымліваюць біяграфічную інфармацыю.

У кнізе змешчаны вельмі вобразна і эмацыянальна напісаныя ўспаміны Уладзіміра Дудзіцкага "Даруй, што я плачу..." і лісты 1946-1948 гадоў Вольгі Таполі, адрасаваныя пісьменнікам Юрку Віцьбічу і Хведару Ільяшэвічу. У заўвагах да апошняга з лістоў згадваецца, што ў 1948 годзе гэтая паэтэса вярнулася ў Беларусь, потым змясціла ў газеце "Голас Радзімы" свае імпрэсіі, дзе захапляліся адноўленым Мінскам — "сапраўднай велічнай сталіцай" (с. 307).

Як і належыць сур'ёзнаму даведачнаму выданню яно завяршаецца "Імянным паказальнікам".

Тамара ШКУРКО.

Анонс

Распачата выданне спадчыны Міколы Равенскага ў сямі кнігах

Як "запеў" прыгадаю асноўныя факты біяграфіі вядомага беларускага кампазітара, музыказнаўца, педагога. Мікола (Мікалай) Якаўлевіч Равенскі нарадзіўся 2 (па іншых звестках 5) снежня 1886 года ў вёсцы Капланцы былога Ігуменскага павета (цяпер Бярэзінскі раён Мінскай вобласці) у сям'і садоўніка. Пачатковую музычную адукацыю атрымаў хлопчыкам у Мінскім архірэйскім хоры, дзе спяваў восем гадоў. Потым быў дырыжорам хору ў мінскім манастыры, хормайстрам у Навагрудку, вучыўся ў Маскве на трохгадовых рэгенцкіх курсах. У 1920-1922 гадах працаваў дырыжорам хору пры Мінскім работніцкім клубе, ездзіў на Случчыну, каб запісваць народныя песні.

У 1922 годзе М. Равенскі выдаў першы свой "Зборнік песень з нотамі". Затым напісаў аперэту "Залёты" паводле п'есы В. Дуніна-Марцінкевіча, сюіту на словы паэмы К. Буйло "Курган". Здольнага кампазітара накіравалі на вучобу ў Маскву, дзе ён закончыў Музычны тэхнікум імя Стасава, Маскоўскую кансерваторыю. Пазнаёміўшыся з паэтам Уладзімірам Дубоўкам, пачаў пісаць оперу "Браніслава" паводле яго вершаў (лічыцца, што партытура загінула).

У 1930 годзе кампазітар вярнуўся ў Мінск. Выкладаў тэарэтычныя дысцыпліны ў музычным тэхнікуме, Беларускай кансерваторыі. Але пасля таго, як бязвіннай ахвярай рэпрэсій аказаўся брат Міколы Равенскага Антон, вымушаны быў пераехаць у Магілёў. У акупацыю вярнуўся ў Мінск, але калабарантам не стаў. Больш таго, яго дачка Лёля загінула ад рук нацыстаў за тое, што дапамагала падпольшчыку І. Казінцу. У 1943 годзе пераехаў у Чэрвень, працаваў там рэгентам царкоўнага хору, пісаў духоўную музыку. А ў 1944 годзе, баючыся рэпрэсій, пакінуў сям'ю і выехаў у Германію, дзе жыў у лагеры для перамешчаных асоб. Працаваў настаўнікам спеваў у беларускіх гімназіях у Міхельсдорфе і Остэргофене, стварыў беларускі жаночы ансамбль, напісаў найбольш вядомы свой твор — гімн "Магутны Божа".

Найбольш плённым перыядам у жыцці М. Равенскага былі 1949-1953 гады, калі ён узначальваў беларускі студэнцкі ансамбль Лювэнскага універсітэта (Бельгія), ездзіў са спевакамі і танцорамі на гастролі па Бельгіі, у Францыю і Германію. Калегі па універсітэту называлі дырыжора ансамбля прафесарам музыкі і спеваў.

Памёр М. Равенскі 3 (па іншых звестках 9) сакавіка 1953 года. Пахаваны ў Лювэне. На яго магіле пастаўлены помнік работы беларускага скульптара Міхася Наўмовіча (Парыж). Памяць пра нашага суайчынніка ўвекавечана на радзіме. У Капланскай школе вучні і настаўнікі стварылі прысвечаны яму музей. А ў Чэрвені, на доме, дзе жыў і працаваў Равенскі, устаноўлена мемарыяльная дошка.

У апошнія гады я разам з калегамі працаваў над падрыхтоўкай "Збору твораў" М. Равенскага ў сямі кнігах. У першую ўвойдуць творы знакамітага кампазітара для фартэп'яна, у другую і трэцюю — вакальныя і літургічныя творы. Чацвёртую і пятую складуць харавыя творы ў суправаджэнні фартэп'яна, харавыя (a capella) творы на вершы беларускіх паэтаў і апрацоўкі беларускіх народных песень. У шостай будуць запісы беларускіх народных песень, а таксама тэарэтычная праца Равенскага "Асаблівасці беларускай народнай песні" (публікуецца ўпершыню).

Падрабязней трэба спыніцца на сёмай кнізе пад назвай "Збор дакументаў і матэрыялаў". Пачнецца яна з "Жыццяпісу Міколы Равенскага паводле архіўных дакументаў кампазітара, архіўных дакументаў розных устаноў, паведамленняў прэсы, сведчанняў сучаснікаў". Між іншым, сюды ўвойдуць "Мой жыццяпіс" М. Равенскага, ліст кіраўніка Наркамасветы БССР ў Паўнамоцнае прадстаўніцтва Савецкай Беларусі ў Маскве з хадайніцтвам паспрыяць М. Равенскаму ў паступленні ў Маскоўскую дзяржаўную кансерваторыю (1923) і асабліва важны для далейшых пошукаў "Акт прыёму-перадачы рэчаў нябожчыка прафесара Міколы Равенскага Студэнцкаму згуртаванню ў Лювэне (Бельгія) і пляменніцы прафесара Міколы Равенскага доктару Руткоўскай Таццяне". Дзесьці на гэтым згуртаванні і гэтай пляменніцы губляюцца сляды славутай скрыпкі кампазітара.

Трэці раздзел сёмай кнігі складуць "Працы Міколы Равенскага" (у тым ліку "Гарманізаванне беларускіх народных песень маскоўскімі кампазітарамі" і "Аб працы над операй "Браніслава"). У чацвёрты ўвойдуць "Матэрыялы пра жыццё і творчасць Міколы Равенскага". Тут чытач сустрэне такіх аўтараў, як Уладзімір Дубоўка, кампазітар Мікола Куліковіч (Шчаглоў), навукоўцы Вітаўт і Зора Кіпелі, дачка кампазітара Вольга Равенская-Аляксеенка (жыве ў Мінску), старшыня таварыства "Беларусь — Бельгія" Тамара Антановіч. У "Дадатку" будуць змешчаны вялікі каталог музычных твораў М. Равенскага, у тым ліку невыяўленых на момант выдання "Збору твораў", хранаграфія яго жыцця, бібліяграфія і дыскаграфія. Завершаць кнігу "Паказальнік імёнаў, біяграмы".



Выхад першай кнігі "Збору твораў" запланаваны на ліпень бягучага года. Сёлета з'явіцца і другая кніга.

З выхадам "Збору твораў" адбудзецца сапраўднае вяртанне спадчыны Равенскага яго нашчадкам. А спадчына гэтая багатая і шматгранная. У ёй шырока выкарыстаны багацці беларускага фальклору. Яго ўздзеянне адчуваецца нават у строгай духоўнай музыцы харальнага складу (Літургія, Екціння). Некаторыя напісаныя Равенскім песні ("Люблю наш край" на словы К. Буйло) доўгі час лічыліся народнымі. Яго творы разнастайныя па настраёвасці, жанраваму дыяпазону.

Вызначальным у шматграннай асобе Міколы Равенскага было імкненне служыць Радзіме, вера ў лепшую будучыню.

Віктар СКОРАБАГАТАЎ,
заслужаны артыст Беларусі.

НА ЗДЫМКАХ І РЭПРАДУКЦЫІ, якія ўвойдуць у "Збор твораў": М. Равенскі; ноты гімна "Магутны Божа"; М. Равенскі са студэнтамі-беларусамі ў Бруселі пасля аднаго з гастрольных канцэртаў.

Міфы, гіпотэзы, адкрыцці

Ці маляваў Рафаэль Скарыну?

Рэдакцыя газеты "Голас Радзімы" атрымала варыянт артыкула пад такой назвай Дзмітрыя Патыкі, раней змешчанага ў газетах "Рэспубліка" і "Belarus Today". Аўтар расказвае пра адкрыццё дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Грыгорыя Равякі, які з дапамогай камп'ютэрнай тэхналогіі выявіў "дзівоснае падабенства аднаго з персанажаў манументальнай работы вялікага італьянца (маецца на ўвазе фрэска Рафаэля "Афінская школа", якая ўпрыгожвае бібліятэку Ватыкана. — Рэд.) з Францішкам Скарынай! Пры гэтым доказы даследчыка настолькі пераканальныя, што з імі нельга не пагадзіцца.

Што ж гэта за "пераканальныя доказы"? Аказваецца, Скарына "якраз у гэты час жыў (?) у Італіі, бываў у Рыме(?), Падуі, дзе абараняў яшчэ адну дысертацыю (?) — па медыцыне". У Падуі беларускі першадрукар сапраўды быў у 1512 годзе — здаваў ва універсітэце экзамены на званне доктара медыцыны. Але не жыў там, а прыбыў туды, як сказана ў дакументах, здалёку. А факты знаходжання нашага суайчынніка ў Рыме скарыназнаўству ўвогуле невядомы.

Тым больш сумніцельна, што Скарына мог падказаць Папе Рымскаму, каб той выбраў маладога Рафаэля ў якасці выканаўцы фрэскі, а ўдзячны мастак намаляваў за гэта першага з іх побач з сабой. Па-першае, фрэска стваралася ў 1508-1511 гадах, а Скарына паехаў у Падую ў 1512 годзе. Падругое, прамыя сувязі беларускага першадрукара з Ватыканам невядомы і наўрад ці ў той час былі магчымы.

Што ж датычыцца партрэтнага падабенства Скарыны, то яго ўвогуле цяжка даказаць, паколькі яго аўтапартрэт — гэта не фатаграфія. Да прыкладу, выява славутага Палачаніна ў Зале сарака Падуанскага універсітэта ад аўтапартрэта вельмі адрозніваецца.

І ўсё ж версія Грыгорыя Равякі знаходзіцца паміж міфам і навуковай гіпотэзай. Мы сапраўды толькі прыблізна ведаем, што рабіў Скарына паміж 1506 і 1512 гадамі — ад Кракаўскага універсітэта да Падуанскага. Таму не друкуючы артыкул Д. Патыкі, канстатуем сам факт існавання такой думкі, няхай і спрэчнай.

Барбара Радзівіл прататып Джульеты?

Газета "Літаратура і мастацтва" змясціла артыкул Алены Чыжэўскай "Што ведаў Шэкспір пра беларусаў?"

У ім сцвярджаецца, што прататыпамі Рамэо і Джульеты былі кароль польскі і вялікі князь літоўскі Сігізмунд II Аўгуст і яго каханка, а потым жонка Барбара з роду Радзівілаў. Маўляў, ім таксама чынілі перашкоды маці каралевіча італьянка Бона Сфорца і браты Барбары. Маўляў, яны больш падобныя на Мантэкі і Капулеці, чым рэальныя італьянскія роды.

На думку аўтара, усю папулярную ў Еўропе гісторыю Шэкспіру маглі расказаць французскія і англійскія пасрэднікі, у тым ліку каранаваныя. Толькі ці сапраўды расказалі? Каханне, якое натыкаецца на жорсткі супраціў бацькоў, даўно стала вандроўным сюжэтам. Як і ў выпадку з Рафаэлем, тут патрэбны больш пераканальныя доказы. А. Чыжэўская і сама разумее хісткасць сваіх пазіцый, бо ў канцы артыкула сцвярджае, што "толькі час і шчаслівы выпадак" могуць даць адказ на пастаўленыя пытанні.

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

Хто з'яўляецца аўтарам Літоўскага Статута?

Аргументаваны, навуковы характар мае мінулагодняя публікацыя літоўскіх даследчыкаў Ірэны Валіконітэ, Эдвардаса Гудавічуса і Станісловаса Лазуткі, прысвечаная першай рэдакцыі Літоўскага Статута (1525).

Дагэтуль аксіёмай лічылася, што асноўным аўтарам гэтага выдатнага помніка еўрапейскай правазнаўчай думкі, напісанага на старабеларускай мове, з'яўляецца Альберт Гоштаўт, ураджэнец Геранён на Лідчыне, віленскі ваявода і канцлер Вялікага Княства Літоўскага. Аднак выяўленыя навукоўцамі дакументы сведчаць, што асноўную ролю ў падрыхтоўцы Статута адыгралі нясвіжскія магнаты браты Мікалай і Ян Радзівілы. Адпаведны заказ яны атрымалі ад польскай каралевы Боны Сфорцы, але адначасова праследавалі і свае патрыятычныя мэты. Актыўна рыхтаваўся тэкст збору законаў.

І тут у 1522 годзе Мікалай Радзівіл памірае. Віленскае ваяводства і канцлерства ім пераймае Гоштаўт. У яго ж рукі перайшоў і "радзівілаўскі" тэкст Статута. Новы канцлер перарабіў яго на свой лад, выдаў яго за сваё тварэнне. Сёння мы назвалі б гэта парушэннем аўтарскага права ці нават плагіятам. Але ў той час такія паняцці не існавалі. Для Гоштаўта, як і для Радзівілаў, важна было зрабіць карысную дзяржаўную справу, якая атрымала вялікі працяг (Статут меў тры рэдакцыі і дзейнічаў на літоўска-беларускіх землях да першай паловы XIX стагоддзя).

Таццяна ПЯТРОВІЧ,
супрацоўніца ІМЭФ імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі.

Алена БУЧЭЛЬ, студэнтка Даўгаўпілскага універсітэта (Латвія)

Сага пра Бусла

Калі гаварыць пра сімвалы краіны, то ў кожнай краіны ён свой. Іх не назначаюць, не прысвойваюць, яны самі выяўляюцца на працягу вякоў. Мне здаецца, што сімвалам Украіны можна лічыць сланечнік, сімвалам Грузіі — вінаград, сімвалам Латвіі — дуб... Адным з сімвалаў Беларусі лічаць Бусла. Прыгожая, велічная птушка. Кажуць, што жыве іх на Беларусі найбольш. Любяць гэту птушку ўсе.

У старажытнасці Бусел быў сімвалам справядлівасці. У Македоніі яе чаканілі на манетах. Старажытныя германцы з-за чырвонай дзюбы лічылі Бусла сваяком грому Тора. Існуе павер'е, што маланка ніколі не ўдарыць у дом, дзе гняздзіцца Бусел. Шанавалі гэту птушку і ў Старажытнай Грэцыі. За разбурэнне буслянкі вінаватых каралі смерцю. Ёсць шмат легенд пра гэтую птушку. Напрыклад, такая:

"Даўней не было ні гадзюк, ні жаб. Аднойчы Бог паклікаў да сябе чалавека і папрасіў яго ўкінуць у мора гаршчочак і даў наказ не развязваць яго. Жонка аднак жа развязала гаршчочак, калі яе гаспадар спаў. І павылазілі адтуль усякія гадзюкі, яшчаркі і жабы. Прачнуўся чалавек, накінуў на плечы белую сарочку, чорную світу і давай збіраць нечысць. А зрабіць нічога не можа. Прыйшоў Бог і кажа тым людзям, што ім цяпер збіраць гадаў усё жыццё і абярнуў іх у Буслоў. З тае пары ходзяць Буслы па балотах у чорных світах, белых сарочках, босыя, з чырвонымі нагамі і збіраюць нечысць усялякую. Стараюцца яны жыць бліжэй да братоў-людзей, бо ведаюць, што людзі не будуць іх біць як братоў сваіх".

Вось адкуль узяліся Буслы. З прычыны сваёй кроўнасці з чалавекам Бусел не адыходзіць далёка ад сядзіб, не баіцца людзей і прыносіць ім шчасце.

Ёсць і такая легенда:

"Чаму Цётка баіцца Буслоў?"

Беларусы верылі, што акрамя Яшчура ў балоце жыве страшная і злая Багіня Цётка, якая часам ператвараецца ў вялікую жабу і душыць людзей, калі яны спяць. Жаба садзіцца чалавеку на грудзі і чалавек памірае, не прачынаючыся. Па-рознаму людзі стараліся задобрыць Жабу, выбіралі для яе самы лепшы вугал, ставілі на падлогу ежу, каб толькі яна не прыгнула ноччу на грудзі. Багіня Рада, якая апякала людзей, злітавалася над імі, спусцілася на зямлю і вырашыла пазмагацца з Цёткай... Цётка ператварылася ў вялізную Жабу, велічынёй з гару і закрыла Сонца, каб Рада не змагла арыентавацца ў цемнаце. Але мудрая Рада ператварылася ў Бусла, вялізнага, з моцнай дзюбай і доўгімі нагамі. Жаба і да грудзей Бусла не даставала. Бусел пачаў біць Жабу дзюбай па галаве, закрычала Жаба і схавалася ў балоце. З таго часу і баіцца Цётка заходзіць у дом чалавека. Яна ловіць толькі тых, хто ходзіць па балоце. А на варце дамоў Рада паставіла Буслоў. Буслы робяць свае гнёзды побач з чалавекам, выводзяць птушанят. Яны ахоўваюць чалавека ад злой Цёткі."

У вогуле існуе вялікая колькасць розных легенд пра Бусла, а таксама існуюць шматлікія прыкметы: першы Бусел — здароўе на цэлы год (Палессе); калі Бусел стаіць — будуць балець ногі, захварэеш, не выйдзеш замуж калі два Буслы — выйдзеш замуж. Пры першай сустрэчы трэба сказаць: "На ціхае лета, на буйнае жыта, а нам на здароўе", ці бегчы за Буслом і прыгаварваць: "Надзялі, Божа, (буслік) здароўем". Бусел прыносіць дзяцей (кідае праз комін); заклічка "Дзядзька Бусел, закружысь калясом! Твае дзеткі за лясом, не ўсе, не ўсе, палавіна ў аўсе"; нельга пакрыўдзіць Бусла — вялікі грэх, найбольш распаўсюджанае пакаранне — пажар (Віцебшчына).

Бусел у народнай культуры "святая птушка", якая ачышчае зямныя воды пасля стварэння міра; ахоўвае зямлю ад гадаў і іншай нечысці; пяро выганяе блыху з дому; знішчае жаб, у якіх ператварыліся ведзьмы; гняздо бусла ахоўвае хату ад злых духаў увогуле; сімвал Хрыста, працаўнік д'ябла; вясной, калі прылятае ў выраю прыносіць апошні снег; калі адлятае — нясе снег пад крыламі; адлятае і прылятае разам з ластаўкамі і сітаўкамі (плескамі); з адлётам часам звязваюць з'яўленне на небе Млечнага шляху (буськавай дарогі) (Піншчына). Палякі лічаць, што Буслы ляцяць далёка за мора на поўдзень, дзе яны ператвараюцца ў людзей, вясной, стукнуўшы ў далоні на беразе мора, зноў становяцца птушкамі і вяртаюцца назад. Чалавек, які трапіць на бераг у гэты час, можа зрабіцца Буслом і пераляцець на Зямлю Буслоў.

Акрамя белых і чорных буслоў на Зямлі існуе яшчэ больш 17 відаў. У многіх краінах Бусла лічаць птушкай, якая прыносіць шчасце. Нельга разбурыць гняздо Бусла — гэта прынясе няшчасце таму дому, дзе ён гняздзіцца. Напэўна, гэта дапамагае яго рассяленню і захаванню.

Чорны Бусел — рэдкая птушка, ён не селіцца каля людзей, часцей — у старых высакаствольных лясах, у глухіх мясцінах, далёка ад чалавечага жылля. Мы часта бачым гнёзды Буслоў на стаўбах, на стагах сена, на башнях, на дахах дамоў. Гнёзды вялікія па аб'ёму і весу, які часам дасягае да аднаго цэнтнера. Ведаеце, у такіх гнёздах селяцца таксама і маленькія птушкі, жывуць тут кутам вераб'і, сітаўкі, шпакі.

У вырай Буслы ляцяць у жніўні. Яны зімуюць у Афрыцы. Спачатку ляціць маладняк, потым — у верасні — дарослыя Буслы. Цікавы факт, што Буслы не бяруць з сабой слабых птушак, яны забіваюць іх насмерць, здараюцца так званыя "буслінныя суды".

Калі старое гняздо ніхто не заняў, Бусел селіцца зноў. Ён яго абнаўляе, чакаючы самку. Запрашаючы ў гняздо самку, Бусел прымае характэрную позу: стаіць у гняздзе, закідвае шыю ажно да спіны і выдае громкі трэск. Ён стукае верхняй часткаю дзюбы аб ніжнюю. У вясельнай цырымоніі ёсць і такая поза: абодва стаяць, выцягнуўшы шыю і галаву і трашчаць дзюбамі. Потым з'яўляецца 2-5 белых яек праз кожныя два дні. Буслы высіжваюць іх трошкі больш за месяц, самка — ноччу, самец — днём. Кормяць птушанят дажджавымі чарвякамі, а ваду бацькі прыносяць у страўніку, нават паліваюць вадой з дзюбы, калі горача. Яны прывязаны да дзяцей.

Беларусы (палякі і ўкраінцы) прыпісваюць Буслу некаторыя чалавечыя асаблівасці (фізічныя, маральныя, псіхічныя, сацыяльныя): у іх чалавечыя пальцы, яны разумеюць мову чалавека, маюць душу, плачуць слязьмі, моляцца Богу (клёкатам), збіраюцца разам, спраўляюць вяселлі. Кожная сям'я манагамная, нераслучная. Калі гіне адзін з Буслоў, другі добраахвотна ідзе на пагібель за ім услед, можа загінуць з-за рэўнасці. Самку, якая здрадзіла, судзяць публічна і забіваюць. Перад адлётам у вырай Буслы збіраюцца на суды.

Бела-чорная афарбоўка звязана па легендах, то з адзеннем шляхціча, то з дваякай прыродай Бусла — чалавек, які саграшыў перад Богам.

У заходніх і ўсходніх славян у фальклорных тэкстах Бусла называюць асабістымі імёнамі: Іван, Іванька, Васыль, Васылык, Васілько, Якаў, Яша, Грыгорый, Рыгор, Гріцько, Адам, Богдан, Войтусь, Войцех.

З нагоды прылёту Буслоў нашы продкі пяклі рытуальнае печыва — галёпы. Дзень сустрэчы птушак прыпадаў на Благавешчанне (25 сакавіка). Выпякалі галёпы з пшанічнай мукі ў выглядзе булачак або коржыкаў рознай формы (у залежнасці ад мясцовых звычаяў). Маглі імітаваць фігуру бусла — з дзюбай, крыламі, лапамі, хвастом. Яго выява магла быць выціснута па печыве зверху. Выпякаліся ў выглядзе буславай лапы або з яе адбіткам (выціскалі трыма пальцамі). Галёпы маглі мець форму сахі, бараны, сярпа і іншае. Пяклі напярэдадні або ў дзень Благавешчання (калі забаранялася пячы хлеб) ці на наступны дзень. Агульнае прызначэнне печыва — сустрэча, кліканне буслоў. Галёпы раздавалі дзецям. Часам печыва проста пакідалі на двары, каб ім пачаставаўся бусел. Астатнія елі самі.

Пелі песню для Буслоў: "Бусел, Бусел, на табе галёпу, дай мне жыта копу; Буську, Буську, на табе барану, дай мне жыта старану; Буська, Буська, на табе сярпа, дай мне жыта снапа."

Запрашаючы Бусла на жыхарства каля хаты, людзі верылі, што ён прыносіць шчасце. Невыпадкова пад гняздо ўстанаўлівалі кола. Кола — гэта і грамавы знак (круг з абазначэннем шасці радыусаў). У беларускіх вёсках яго ставілі на дзвярах для захавання хаты ад удару маланкі. Значыць гняздо — кола таксама абяцала сядзібе ўдачу і ахову (ад Перуна).

Ёсць цікавая кніга Уладзіміра Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі". Яна пра Беларусь, пісьменнік лічыць, што Буслы да пэўнай ступені сімвал Беларусі, пад іхні палёт добра думаецца пра родную Беларусь. Дарэчы, ён прыводзіць некалькі варыянтаў паходжання назвы Беларусь. Першы: белае адзенне даўніх вясковых людзей, белыя валасы і белы колер скуры. Другі: калі на старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы, адбіліся ад іх амаль толькі беларусы. Менавіта таму беларусы "белыя", "свабодныя, чыстыя ад нашэсця татараў" — Белая Русь.

...І зноў Буслы — прыгожыя, велічныя прыляцелі з выраю. Паглядзіце на іх, успомніце родную Беларусь. Можа, недзе там, у родным куточку, яны звілі сваё гняздо і прынясуць шчасце вашым блізкім... А шчаслівым хочацца быць кожнаму незалежна ад узросту, нацыянальнасці, краіны, дзе мы жывём. Галоўнае, што ўсе жывём на вялікай планеце Зямля, якую трэба любіць, шанаваць, аберагаць.

Пераклад
Андрэ Маруа

Сабор

У 18... годзе каля вітрыны гандляра карцінамі на вуліцы Сент-Анарэ спыніўся студэнт. На вітрыне была выстаўлена карціна Манэ "Шартрскі сабор". У той час жывапісам Манэ захапляліся толькі лічаныя аматары прац мастака, але ў студэнта быў добры густ: цудоўная карціна прывяла яго ў захапленне. Ён амаль штодзённа прыходзіў да гэтага шапіка, каб паглядзець на карціну. Нарэшце ён адважыўся ўвайсці ў шапік і даведацца пра яе кошт.

— Што ж, — адказаў гаспадар шапіка, — карціна ўжо даўно тут вісіць. За дзве тысячы франкаў я, бадай, уступлю яе вам.

Студэнт не меў такой сумы грошай, але яго сям'я, якая жыла ў правінцыі, была заможнай. Калі ён ад'язджаў у Парыж, дзядзька яму сказаў: "Я знаёмы з жыццём, якое вядуць маладзёны ў сталіцы. Калі табе спатрэбяцца грошы, напішы мне". Студэнт папрасіў гаспадара не прадаваць карціну на працягу тыдня і напісаў ліст дзядзьку.

У нашага героя ў Парыжы была каханка. Была яна замужам за чалавекам, які быў нашмат старэйшы за яе, яна знемагала ад нуды. Была яна крыху вульгарнай, досыць дурнічка, але вельмі прывабная сабою. У той самы вечар, калі студэнт даведваўся пра кошт "Сабору", каханка яму сказала:

— Заўтра я чакаю да сябе ў госці сяброўку па пансіёну. Яна прыедзе з Тулона, каб пабачыцца са мною. Мужу нас забаўляць німа часу — уся надзея на вас.

Сяброўка прыехала на наступны дзень і прывезла з сабою прыяцельку. Некалькі дзён запар студэнту прыйшлося вазіць трох кабет па Парыжу. Ён плаціў за ўсё: за абеды, фіякр, тэатр і вельмі хутка распусціў грошы, на якія павінен быў жыць цэлы месяц. Ён пазычыў у сябра і ўжо пачаў турбавацца, як быць далей, як раптам прыйшоў ліст ад дзядзечкі. У ім былі дзве тысячы франкаў. Студэнт уздыхнуў з палёгкаю. Ён аплаціў даўгі і зрабіў падарунак каханцы. А "Сабор" набыў калекцыянер, які пасля, праз многія гады, перадаў свае карціны ў Луўр.

Зараз той студэнт — стары вядомы пісьменнік. Але сэрца яго засталося маладым. Ён па-ранейшаму ў захапленні спыняецца на месцы, пабачыўшы цудоўны пейзаж або прыгожую жанчыну. Часцяком ён сустракае на вуліцы гнюлую кабету, якая жыве па суседству. Гэтая жанчына — яго былая каханка. Твар яе запыў тлушчам, пад некалі такімі прыгожымі вачыма напухлі мяшкі, над верхняю губой тырчаць сівыя валаскі. Яна з цяжкасцю перасоўваецца — відаць, друзьлыя ногі дрэнна яе слухаюцца. Пісьменнік галантна з ёю раскланьваецца і, не затрымліваючыся, спяшаецца далей, яму добра вядомы яе зласлівы нораў і непрыемна ўспамінаць, што калісьці ён кахаў яе.

Часам ён наведваецца ў Луўр і падымаецца ў залу, дзе вісіць "Сабор". Ён доўга пазірае на карціну і ўздыхае.

З французскай мовы пераклаў
Пятрусь КАПЧЫК.

Латвія, Рыга

Ігар Лучанок:

"Песні, як дзеці: усе родныя і ўсе дарагія"

У сталіцы Латвіі, у Доме Рыжскага латышскага таварыства, адбылася творчая вечарына беларускага кампазітара Ігара Лучанка. У ёй удзельнічалі яго землякі — прафесійныя і самадзейныя артысты з усёй Латвіі. Тут гучала ў асноўным беларуская мова, і яна была зразумелая ўсім у зале — бо гэта мова прыгожых і ўсім добра знаёмых песень.

Задумана гэта сустрэча кіраўнікамі Саюза беларусаў Латвіі была даўно. Яго старшыня Валянціна Піскунова звярнулася да Ігара Лучанка, і той з радасцю прыняў запрашэнне прыехаць у Латвію. Больш таго, спачатку даслаў ноты сваіх песень, каб беларускія салісты і творчыя калектывы з Рыгі, Даўгаўпілса, Вентспілса, Ліепаі, Прэйлі развучылі яго творы да сустрэчы.

І хутка настаў доўгачаканы дзень. На вечарыну вядомы кампазітар прыехаў разам з сынам Андрэем і народным артыстам Беларусі Іванам Краснадубскім. Сабралася шмат гасцей: дыпламатычныя прадстаўнікі Беларусі, Расіі і іншых дзяржаў, дэпутаты Сэйма Латвіі, прадстаўнікі міністэрства інтэграцыі, многіх нацыянальна-культурных таварыстваў, а таксама вядомы кампазітар Райманд Паўлс з жонкай і спявачкай Вольгай Пірагс. Тры гадзіны працягваўся канцэрт, на якім гучалі вядомыя і новыя творы кампазітара. Атрымалася сапраўднае свята беларускай песні. А пасля яго Ігар Міхайлавіч згадзіўся даць невялікае інтэрв'ю. Мы размаўлялі на роднай беларускай мове.

САПРАЎДНАЯ ПЕСНЯ — ГЭТА ЦЯЖКАЯ РАБОТА

— З якім настроем вы ехалі ў Латвію да сваіх землякоў?

— З вялікім жаданнем сустрэцца з імі і са сваімі сябрамі. З Латвіяй мяне многае звязвае. Пазнаёміў мяне з ёю І Усесаюзны фестываль песні. На ім я працаваў разам з Аляксандрай Пахмутавай, Маркам Фрадкіным, Юрыем Сіланцьевым... Потым бываў на ВЭФе, прыязджаў адпачываць у Юрмалу, а галоўным чынам з творчымі планамі: сустракаўся з Раймандам Паўлсам, іншымі музыкантамі — маімі сябрамі. Таму мае ўспаміны аб Латвіі ў асноўным музычныя.

У той час я з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і таму сюды даводзілася прыязджаць і па справах. Не буду гаварыць пра палітыку. Хочацца толькі паўтарыць банальную думку: песня не мае межаў, хоць яны і ўстанаўліваюцца палітыкамі. У Беларусі ведаюць латышскія песні і майстроў эстрады з Латвіі. А мая мара — прыязджаць сюда зноў і зноў.

— Што можаце сказаць пра сённяшняе становішча культуры ў Латвіі?

— Не буду гаварыць пра ўсё, лепш — пра музыку. У Латвіі добрыя музычныя традыцыі. Яны былі ў савецкі час, актыўна працягваюць развівацца і сёння, дзякуючы такім творчым асобам, як Райманд Паўлс, Лайма Вайкуле, Вольга Пірагс. Таму іх хацелася бачыць на маёй творчай вечарыне. Я рады, што Вольга не так даўно прыязджала ў Мінск, у Магілёў, цудоўна спявала латышскія, рускія і беларускія песні, у тым ліку і мае.

— А творчасць каго з латышскіх дзеячаў культуры вам найбольш блізкая?

— Я нядрэнна знаёмы і з латышскай літаратурай, паэзіяй. Ёсць у ёй цудоўныя творы! А ў музыцы, вядома ж, бліжэй мне творчасць Райманда Паўлса. А наогул, творчыя людзі Латвіі, на мой погляд, працуюць цікава, тут ёсць чаму па-сапраўднаму павучыцца. Васільева, "Верасы", Ярмоленка са сваімі "Сябрамі", і, вядома ж, "Песняры". Праўда, іх у нас ужо некалькі (смяецца. — *В. Г.*): адны пад кіраўніцтвам Шарапава, другія — Барткевіча. Але хачу сказаць, што самае галоўнае — гэта беларуская народная песня. Таму Мулявін — гэта Мулявін, і для мяне, і для ўсёй Беларусі. Ён заўсёды быў удзячны кампазітарам — і Пахмутавай, і мне, і Райманду Паўлсу. І ўсё ж, галоўнай для яго была народная песня. Думаю, латышская народная песня таксама вельмі дарагая для ўсіх латышоў. Песню стварае народ, а кампазітар яе толькі аранжыруе.

— Якая песня вам асабліва дарагая?

— Я — прафесійны кампазітар, вучыўся гэтай справе ў Мінску, Маскве, Ленінградзе. Песні, калі да іх сур'ёзна адносіцца, як дзеці: усе родныя і дарагія табе. Магу выдзеліць "Спадчыну", "Мой родны кут", "Жураўлі на Палессе ляцяць".

— Дарэчы, беларусы Латвіі, як і ўсе беларусы замежжа, лічаць вашы "Жураўлі..." сваім гімнам. Нацыянальная праграма: "На Домской площади" Латвійскага радыё пачынаецца менавіта з яе.

— А калі пазвоніце ў Пасольства Беларусі ў Маскве, вы і там пачуеце пазыўныя "Жураўлёў"...

— Сёння вашы песні выконвалі латвійскія беларусы — і прафесійныя спевакі, і самадзейныя выканаўцы. Як вы ацэньваеце ідэю менавіта такой сустрэчы ?

— У апошні час моладзь больш цягнецца да "зорак", яе больш вабіць поп-музыка. Але, калі песня атрымалася, то яна будзе прынята ўсімі слухачамі. Калі з маіх песень застанецца на доўгія гады хаця б адна — я буду шчаслівы чалавек. Сапраўдная песня прыходзіць рэдка. Гэта вялікая ўдача. Я рады, што беларусы Латвіі спяваюць мае песні. Для вас і для мяне творчы вечар — сустрэча з юнацтвам. І — настальгія. СССР ужо даўно няма, а песні, напісаныя ў той час, жывуць, і яны нас, як і раней, аб'ядноўваюць.

— А для беларусаў Латвіі — гэта яшчэ і сустрэча са сваім земляком — блізкім і родным чалавекам. Многія кажуць, што сёння быццам дома побывалі.

— Дарэчы, ці ведаеце вы, што на мяжы Беларусі і Украіны ёсць вёсачка Лучанкі. Што такое лучык? Магчыма, ад слова "луч". А значыць, нешта светлае. Бацька мой мае ўкраінскія карані, а мама — беларуска. Мяне ж і ўкраінцы лічаць сваім кампазітарам. А я сябе не ўяўляю без Расіі. Кожны месяц бываю ў Маскве. Хоць кампазітар я — беларускі. Вось так у жыцці атрымліваецца...

З МІНСКА Ў ЛІЕПАЮ

З прыездам Ігара Лучанка звязаны прыемны момант у жыцці ансамбля беларускай песні "Паўлінка" з Ліепаі. Разам з ім для гэтага маладога калектыву "прыбылі" нацыянальныя касцюмы — падарунак Міністэрства культуры Беларусі. Падарунак доўгачаканы і вельмі своечасовы: восенню ансамблю спаўняецца 5 гадоў. Прыгожыя абноўкі ў юбілей — што для дзяўчат можа быць больш жаданым?! Прадстаўнікі ліепайскай беларускай суполкі "Мара", прымаючы падарунак, адзначылі:

— Для нас ён вельмі дарагі. Нацыянальны касцюм — важны элемент культуры. У ім — белая квецень нашых вясенніх садоў, непаўторная зелень беларускага Палесся, цудоўныя ўзоры беларускага арнаменту. Даўно хацелася паказаць жыхарам нашага горада сапраўдны беларускі нацыянальны касцюм. Цяпер гэта магчыма.

Актывісты "Мары" запрасілі Ігара Лучанка ў свой горад, які мае добрыя музычныя традыцыі. А яшчэ ён напісаў сваім землякам з горада пад ліпамі: "Супольцы "Мара" — дзякуй за сустрэчу! Жадаю ўсяго добрага!"

Валянціна ГРЫБОЎСКАЯ,
намеснік старшыні суполкі беларусаў Ліепаі "Мара".

НА ЗДЫМКУ: Ігар ЛУЧАНОК разам са сваімі землякамі ў Ліепаі.

Фота Канстанціна ВЫСОЦКАГА.

Расія, Новасібірск

"Карагод сяброў" склікалі беларусы

Фестываль "Карагод сяброў-2005" прайшоў у Новасібірску ў рамках Дзён беларускай культуры. Яго арганізатарам стаў Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у імя святой Ефрасінні Полацкай. Дарэчы, Дні беларускай культуры штогод праводзяцца напярэдадні ці ў дзень нараджэння заступніцы зямлі Беларускай. Мы звяталіся па тэлефоне з намеснікам дырэктара па культуры Беларускага цэнтра Людмілай ШЧАСЛІВЕНКА:

— Першы рэгіянальны фестываль беларускага танца "Карагод сяброў" у рамках Дзён беларускай культуры ў нашым горадзе пачаўся 4-га чэрвеня і доўжыўся тры дні. Праходзіў ён ў Палацы культуры імя Горкага. А 5 чэрвеня, у дзень нараджэння Ефрасінні Полацкай, адбыліся ўрачыстасці ля храма ў гонар беларускай асветніцы. З'ехаліся ў Новасібірск 26 калектываў мастацкай самадзейнасці з розных рэгіёнаў Сібіры. Асабліва актыўнымі былі аддзяленні беларускай грамадскай арганізацыі нашай вобласці і горада. Але прыязджалі да нас і госці.

Хто не ўбачыў фінальны гала-канцэрт, які адначасова быў і конкурсам, той многае страціў. Якое здзіўленне было нашых гледачоў, калі, адкрываючы праграму канцэрта, яны бачылі аднолькавыя назвы нумароў, напрыклад, танец "Лявоніха", "Полька-Янка", "Весялуха", "Крыжачок" і іншыя паўтараліся па некалькі разоў... Гэта быў такі калейдаскоп не толькі танцаў, але і адпаведных беларускіх касцюмаў на сцэне! Мы, работнікі цэнтра, былі шчаслівыя, што нам удалося наладзіць такое свята! Адзначылі нас і гарадскія ўлады. На фестывалі выступаў намеснік мэра горада Новасібірска Валерый Фёдараў.

Прыемна адзначыць, што журы ўзначальвала Алена Рыбчынская, балетмайстар, дацэнт кафедры беларускай народнай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў з Мінска. Гэта быў такі дарагі для нас госць! Другі дзень фестывалю Алена Рыбчынская прысвяціла майстар-класу. Яна паказала беларускія танцы сібірскім харэографам. Зала была поўная! Жадаючых было так многа, што рэпетыцыйную залу давялося памяняць на большую.

Гасцямі фестывалю былі беларусы Іркуцка. Нашы землякі нас вельмі парадавалі. Яны прывезлі цудоўныя архаічныя беларускія танцы, у якіх гарманічна спалучаюцца старажытнасць і сучаснасць. У іх незвычайныя, прыгожыя касцюмы. Госці з Іркуцка сталі лаўрэатамі фестывалю.

Прыязджалі да нас суайчыннікі з гарадоў Берска і Крыванаўкі. На фестывалі ў асноўным выступалі маладыя людзі і дзеці. І раптам на сцэну выходзяць вусатыя дзяцькі з Крыванаўкі і пачынаюць танцаваць з бубнамі "Крутуху" ці беларускую "Кадрылю"! Было вельмі цікава...

Фестываль быў прысвечаны 60-годдзю Вялікай Перамогі. У першых радах гледачоў былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. І было такое цудоўнае імгненне ў маім жыцці, калі Герой Савецкага Саюза Дзмітрый Аляксеевіч Бакураў, які вызваляў Беларусь, удзельнік Парада ў гонар 60-годдзя Перамогі, устаў і звярнуўся да ўсіх прысутных у зале і на сцэне (там было звыш 300 удзельнікаў фестывалю "Карагод сяброў"): "60 гадоў таму, калі мы вызвалялі Беларусь, яе жыхары выходзілі з зямлянак і выносілі нам тое, чым былі багатыя самі. Прайшло столькі гадоў. І сёння ... бірскія беларусы дораць нам у падарунак сваё мастацтва. Мне, удзельніку вайны, гэта так прыемна. Не страчана сувязь пакаленняў! І Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр уносіць сваю лепту, каб нашы народы былі разам."

Ганна МАХАВІКОВА.

Спорт

Іван Ціхан і ў рэйтынгу першы

Беларускі кідальнік молата Іван Ціхан у апошнім рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі выйшаў на першае месца.

Намеснік старшыні дырэктарата нацыянальных каманд Міністэрства спорту і турызму Анатоль Іваноў напомніў, што на Алімпійскіх гульнях-2004 у Афінах Ціхан у час спаборніцтваў паказаў трэці вынік. Але пасля дыскваліфікацыі пераможца алімпійскага турніру венгерскага атлета, беларусу пазней была ўручана сярэбраная узнагарода Гульняў. На апошнім буйным турніры ў польскім Быдгашчы наш малатабоец заняў першае месца, кінуўшы снарад на 79 м 39 см.

А самы далёкі кідок з беларусаў у сёлетнім сезоне выканаў у Японіі Вадзім Дзевятоўскі. Яго молат прызямліўся на адзнацы 80 м 17 см. На Гульнях у Афінах атлет заняў чацвёртае месца.

Надзея Астапчук штурханула ядро далей за ўсіх

Надзея Астапчук устанавіла сусветнае дасягненне сезона ў штурханні ядра. Гэтага выдатнага поспеху яна дасягнула на міжнародным турніры ў Ульме (Германія).

У сваёй лепшай спробе беларуска штурханула снарад на 20 метраў 9 сантыметраў. У гэтым сезоне яшчэ ніхто так далёка не засылаў пяцікілаграмовы яблык".

Сярэбраны алімпійскі прызёр Надзіне Кляйнерт з Германіі адстала ад беларускі на 72 сантыметры. Узыходзячая зорка нямецкай каманды Петра Лаверт не зрабіла і таго, спыніўшыся на адзнацы 18,86 метраў.

На іншых міжнародных турнірах вылучыліся наш Павел Сыжын, у яго другі вынік у штурханні ядра на Мемарыяле Януша Кусачынскага ў Варшаве — 20,22 метраў. Там жа вылучылася Святлана Усовіч, якая прабегла 400 метраў за 51,87 секунд. Аляксандр Вашчыла паказаў трэці вынік у кіданні молата — 73,38 м.

Кацярына Карстэн набірае хуткасць

Беларуска Кацярына Карстэн другі раз у гэтым сезоне стала пераможцай у спаборніцтвах на Кубак свету па акадэмічным веславанні. Яна была лепшай на кубкавым этапе, які праходзіў у Мюнхене.

Вынік Карстэн — 7 хвілін 58,82 секунды.

У стралкоў — трэцяя алімпійская ліцэнзія

Беларускія стралкі заваявалі трэцюю алімпійскую ліцэнзію на Гульні-2008 у Пекіне.

Галоўны трэнер зборнай Ігар Басінскі ў інтэрв'ю сказаў, што ён задаволены выступленнямі сваіх выхаванцаў. На кожным з этапаў Кубка свету беларускія снайперы падымаліся на першую ступень п'едэстала гонару, што дае права на валоданне жаданай пуцёўкай.

На гэты раз чарговы алімпійскі трафей беларускія стралкі прывезлі з Мілана, дзе вылучыўся Пётр Літвінчук. Ён быў лепшым у стральбе лежачы з малакаліберной вінтоўкі. Трошкі не хапіла для перамогі Людміле Чабатар у стральбе з пнеўматычнага пісталета. Яна прайграла ўсяго восем сотых бала кітаянцы Хо Лім Лі.

Як мяркуюць спецыялісты, беларускія снайперы маюць добрыя шансы паспяхова выступіць на будучай Алімпіядзе. На папярэднім кубкавым этапе ў Мюнхене вылучыўся Сяргей Мартынаў, які таксама стаў пераможцам у стральбе з малакаліберной вінтоўкі. Галоўны трэнер лічыць Мартынава асноўным прэтэндэнтам на адну з алімпійскіх узнагарод у Пекіне. Ён нагадаў, што менавіта Сяргей на Алімпійскіх гульнях-2004 у Афінах заваяваў для беларускай каманды бронзавы медаль.

Высокія вынікі паказвае Вікторыя Чайка, бронзавы прызёр Кубка свету 2003 года. Няўдача ў Афінах прымусіла яе крытычна ацаніць свае дзеянні на агнявым рубяжы, унесці папраўкі ў стралковую падрыхтоўку. Гэта дапамагло спартсменцы праявіць вялікія патэнцыяльныя магчымасці і дабіцца перамогі на адным з цяперашніх кубкавых этапаў, а разам з ёй заваяваць алімпійскую пуцёўку.

Беларускія лёгкаатлеты — пераможцы Кубка Еўропы

Каманда беларускіх лёгкаатлетаў стала пераможцай Кубка Еўропы ў дывізіёне "В", што дазволіла ёй перамясціцца ў першую лігу.

Добры прыклад камандзе паказаў Андрэй Шаланько — ён не толькі перамог у бегу на 110 метраў з бар'ерамі, але і ўстанавіў уласны рэкорд.

Падрыхтавала Яна ГОМАН.

Рэкламны бізнес

Беларускі твар сусветных брэндаў

Кожны год у Беларусі праходзяць шматлікія конкурсы і паказы, якія без мадэлей адбыцца не змаглі б. Гэта ў першую чаргу конкурсы прыгажосці "Міс Беларусь" і "Твар новага стагоддзя". Вопыт прафесійных мадэлей неабходны на дэманстрацыйных паказах адзення, конкурсах дызайнерскага мастацтва і такіх выставах, як "Нявеста года". Важнае значэнне ў кар'еры мадэлі мае ўдзел у паказах "Мамант", "Белая амфара", "Мельніца моды". Атрымаць асалоду ад прагляду модных стрыжак і даведацца аб напрамках, якія пануюць у свеце, можна на такіх мерапрыемствах, як Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па цырульнаму мастацтву, "Interstyle", "Schwarzkopf. Кубок Osis" і "Wella. Trend Visin". Дарэчы, у такіх конкурсах удзельнічаюць як прафесійныя мадэлі, так і дзяўчаты, якія хочуць з дапамогай дызайнераў і цырульнікаў змяніць стыль, унесці ў сваё жыццё новую хвалю ўражанняў і пачуццяў.

Вельмі актыўна ў апошні час беларускія мадэлі сталі прыцягвацца да рэкламы. І гэта невыпадкова: сёння ў краіне надаецца пільная ўвага развіццю мадэльнага бізнесу, а ён у сваю чаргу цесна звязаны з рэкламай.

Спажывецкая рэклама пачала актыўна выкарыстоўвацца ў Беларусі ў пачатку 90-ых гадоў мінулага стагоддзя, калі з'явіліся першыя бігборды. З іх нам па-галівудскі ўсміхаліся прыгожыя іншаземцы і прымушалі звяртаць увагу на папяросы "Мальбара" ці цянучку "Спімарал". Рэклама — рухавік прагрэсу, яна стымулюе спажыўцоў купляць тавары, а вытворцаў — ствараць іх лепей і больш. Але хутка амерыканскія каўбоі і англійскія лэдзі пачалі надакучваць, і рэклама перастала востра ўспрымацца. Што і падштурхнула да важных пераўтварэнняў у рэкламным бізнесе: пачалася замена твараў іншаземцаў на плакатах на родныя беларускія. Новаўвядзенне закранула ўсіх: мадэлей, рэкламныя агенцтвы, беларускіх і замежных прадпрымальнікаў, спажыўцоў.

Першая змена — самая жорсткая: уся рэклама павінна быць зроблена ў Беларусі. Таму, каб бігборд з'явіўся на вуліцах беларускіх гарадоў, патрэбна мець неабходныя дакументы і дамову, якая пацвярджае, што рэклама створана ў краіне. Затое значна панізіліся цэны на рэкламныя паслугі для айчынных вытворцаў. Льготы беларускім прадпрымальнікам прадстаўляюць дзяржаўныя газеты, тэле— і радыёканалы, а таксама аўтапаркі, чыгунка, мятро, аэрапорты і аўтавакзалы. Вытворцы рэкламы таксама зацікаўлены ў больш цесным узаемадзеянні з айчыннымі прадпрымальнікамі: гаспадар рэкламнай плошчы робіць скідку дзяржаўнаму прадпрыемству, а сам атрымлівае палёгку ад Мінгарвыканкама. Менавіта такі механізм супрацоўніцтва паступова ўсталёўваецца ва ўсіх сектарах рэкламнага рынку.

Другое патрабаванне заключаецца ў тым, што на плакатах павінны быць толькі беларусы. Прычым, даволі часта тварамі кампаній становяцца зоркі беларускай эстрады і спорту. Так, тэнісіст Максім Мірны і бягуха Юлія Несцярэнка прэзентуюць аператара мабільнай сувязі "Velcom", а спявачка Алеся стала тварам беларуска-італьянскай касметычнай фірмы "Беліта".

Большасць арганізацый пры пошуку прыгожага беларускага твару карыстаецца прапановамі мадэльных агенцтваў. У нас пакуль няма адзінай базы даных беларускіх мадэлей, але саміх агенцтваў дастаткова. Гэта і мадэльнае агенцтва Сяргея Нагорнага, і школа мадэлей "Stars", і агенцтва школы Сашы Варламава, і школа мадэлей "Тамара". З колькасцю мадэлей таксама не ўзнікае ніякіх праблем: Беларусь не адчувае недахопу ў прыгожых тварах. На сайтах кожнага агенцтва размешчана ўся неабходная інфармацыя пра прыгажунь, умовы работы з імі. Але часцей за ўсё неабходную мадэль знаходзяць праз кастынгі. Такім чынам падабралі сабе дзяўчат прадпрыемствы па пашыву ніжняй бялізны "Мілавіца"і "Serge", кампанія па пашыву жаночага адзення "Nelva" і іншыя.

Самай складанай праблемай з'явілася адаптацыя вядомых сусветных брэндаў, асабліва для тых прадпрымальнікаў, якія выпускаюць сваю прадукцыю на тэрыторыі Беларусі, напрыклад, Макдональдс ці Кока-Кола. Але яны паступова спраўляюцца, і зараз беларусы на іх плакатах п'юць шыпучку і частуюцца гамбургерамі. Нестандартна да вырашэння пастаўленай праблемы падышла кампанія "Самсунг": цяпер яе "слоганы" для сотавых тэлефонаў гучаць на беларускай мове.

Мадэльны бізнес у краіне такім чынам выйшаў на новы ўзровень: беларускія дзяўчаты рэкламуюць ужо не толькі айчынную касметыку, кандытарскія вырабы і бялізну, а становяцца тварамі прадстаўніцтваў замежных кампаній.

Увогуле ў апошні час назіраецца тэндэнцыя павышэння цікавасці з боку маладых людзей да работы мадэлі, усё больш хлопцаў і дзяўчат спрабуюць сябе ў гэтым бізнесе. І справа тут зусім не ў тым, каб стаць прафесійнай мадэллю. Напэўна, прычына ў жаданні самасцвярджэння праз агульнае прызнанне прыгажосці.

Кацярына НЕМАГАЙ.

Фота Наталлі НАВУМЕНКА.

Фестываль

Звіняць цымбалы, грае гармонік!

Пачатак на 1-й стар.

Такія, як, напрыклад, народны ансамбль народнай музыкі "Палескі сувенір" з Пінска, ансамбль гарманістаў Гарадоцкага раённага метадычнага цэнтра, народны ансамбль "Верас" з Гомеля, народны ансамбль старажытнай беларускай музыкі "Пастараль" з Дзяржынска, узорны аркестр цымбалістаў "Абярэг" Беларускага рэспубліканскага навучальнага комплексу гімназія-каледж, іншыя калектывы і выканаўцы.

Прывітанне ўдзельнікам фестывалю направіў віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Дражын.

У рамках міжнароднага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах на ступеньках Палаца Тызенгаўза прайшло тэатралізаванае прадстаўленне "Старонкі ажыўшай гісторыі", на якім выступілі самыя маленькія ўдзельнікі фестывалю — навучэнцы музычнай школы ў Паставах. Акрамя таго, у горадзе адбыўся плацканцэрт духавога аркестра Пагранічных войск Беларусі, а таксама танцавальна-пацяшальная праграма "Вечарына ў Паставах" з удзелам фальклорнай групы "Неруш".

Захаванне і развіццё народных традыцый — высакародная і святая мэта пастаўскага фестывалю "Звіняць цымбалы і гармонік". Такімі словамі адкрыў заключны гала-канцэрт старшыня Пастаўскага райвыканкама Эдуард Казура. Ён адзначыў, што міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" сабраў на Пастаўскай зямле некалькі тысяч прыхільнікаў народнай музыкі і песень. "У нашым рэгіёне, — адзначыў Эдуард Казура, — высокая інструментальная культура, якая пачала фарміравацца яшчэ ў XVII стагоддзі, так што фестываль народнай музычнай культуры знайшоў сваё прыстанішча апраўдана".

Пераможцам конкурсу выканаўцаў на народных інструментах "Хто каго?" на заключным гала-канцэрце былі ўручаны спецыяльныя дыпломы, прэміі і памятныя падарункі. У конкурснай праграме прынялі ўдзел больш за 500 выканаўцаў, 10 з іх атрымалі званне лаўрэатаў міжнароднага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік". Журы конкурсу пры ацэнцы ўлічвала не толькі выканаўчае майстэрства і сцэнічную культуру ўдзельнікаў, але і захаванне рэгіянальных традыцый і асаблівасцей музычных твораў. Лаўрэатамі конкурсу ў індывідуальным выкананні сталі Васіль Семашкевіч з Жодзіна (Мінская вобласць), Іван Сухой (Украіна), дуэт Марыя Шарый і Аляксандр Жых (Мінск), Міхаіл Касцюкевіч (Мінск), дуэт Уладзімір Барысюк і Яна Бачкоўская (Паставы). Журы таксама вылучыла пяць калектываў, якія па выніках конкурсу сталі лепшымі сярод аркестраў і ансамбляў народнай музыкі — заслужаны аматарскі фальклорны ансамбль выкладчыкаў дзіцячай музычнай школы "Паазер'е" з Пастаў, народны ансамбль старажытнай беларускай музыкі "Пастараль" з Дзяржынска, узорны ансамбль народнай музыкі "Гулянок" са Смаргоні, калектыў "Віюшытэ" з Літвы, а таксама ансамбль гарманістаў музычнай школы з Украіны.

Юлія ВАНІНА.
Фота Андрэя БАРАДУНА.

Выстава 11-гадовага мастака з Брэста

У сценах Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі адбылася 10-я выстава 11-гадовага брэсцкага мастака Яраслава Сафонава, якога ўжо называюць модным мастаком, а творы параўноўваюць з безсюжэтнымі матывамі Далі.

Яраслаў Сафонаў у вялікім мастацтве — з шасці гадоў. Сваё бачанне тэмы сяброўства і свету перанёс на паперу, даслаў на конкурс у Германію — і перамог. З таго часу шмат вады ўцякло. Ад жывапісу Яраслаў перайшоў на графіку. Стаў не проста брэсцкай славутасцю, паспеў выставіцца ў Англіі, Расіі і ў гарадах Беларусі.

У Мінск юны Сафонаў прывёз выбранае. Увесь свой, зусім недзіцячы, сюррэалізм.

Іван Васільеў — пераможца конкурсу артыстаў балета ў Маскве

Залатога медаля і дыплома лаўрэата ўдастоены навучэнец Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа Іван Васільеў на Міжнародным конкурсе артыстаў балета і харэографаў. Прэстыжны агляд, 10-ы па ліку, праходзіў у Маскве ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры з 20 па 30 чэрвеня.

Конкурс з'яўляецца адным з самых значных, прэстыжных і буйных спаборніцтваў таленавітай моладзі, якая прысвяціла сваё жыццё балету.

Пераможца творчага спаборніцтва сярод юнакоў Іван Васільеў не ўпершыню дастойна прадстаўляе Беларусь на міжнародным аглядах. Так, у мінулым годзе танцор быў удастоены бронзавага медаля і двух спецыяльных прызоў на балетным конкурсе ў Варне (Балгарыя).

Спорт і мастацтва як лекі ад наркотыкаў

Музычна-спартыўны марафон, прысвечаны Міжнароднаму Дню барацьбы з наркотыкамі, прайшоў у Салігорску.

Ён стаў фінальным шоу кампаніі "Міншчына супраць наркотыкаў", якая праходзіла на працягу некалькіх месяцаў ва ўсіх раённых гарадах вобласці, пры садзейнічанні ЕС/ПРААН Мінаблвыканкама і Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Марафон праходзіў на стадыёне "Будаўнік". У час музычна-спартыўнага шоу адбыліся выступленні зорак эстрады, выступленні алімпійскіх чэмпіёнаў, рэкардсмена свету па гіраваму спорту Вячаслава Харанекі, прайшоў матч паміж барысаўскімі і салігорскімі камандамі-фіналістамі па футболу сярод дваровых каманд з удзелам "цяжкіх падлеткаў". Завяршыўся марафон урачыстым ўзнагароджаннем пераможцаў акцыі "Міншчына супраць наркотыкаў", галоўная мэта якой — прапанаваць падлеткам і моладзі альтэрнатыву наркаспажыванню, а таксама — прапаганда здаровага ладу жыцця і заняткаў спортам.

Падрыхтавала Яна ГОМАН.

«Голас Радзімы»
Намеснік рэдактара
Таццяна КУВАРЫНА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Незалежнасці, 44.
Тэлефоны: (+375 – 17) 288 – 11 – 97 (бухгалтэрыя), 288–12–80, 284–76–56, 288– 17– 82 (тэл./факс).
Галоўны рэдактар: 8029– 6– 88– 17– 82. Email:golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ: http://www.belarus21.by

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 2006 экз. Заказ 752. Падпісана да друку 12. 06. 2005 г. у 12.00.
Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе. Знакам R пазначаны рэкламныя матэрыялы.
Аддрукавана ААТ «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.
© «Голас Радзімы», 2005.